

БЛАКАДНЫ ЛЕНІНГРАД ВАЧЫМА ВІДАВОЧЦЫ **5**



«ПАПЯЛУШКА» ВЯЛІКАГА ТЭАТРА **6**

13 ЛІПЕНЯ 2024 г.
СУБОТА
№ 135 (30269)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З першых вуснаў

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» СТАЎ СЯМЕЙНЫМ СВЯТАМ, СВЯТАМ ТРАДЫЦЫЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ»



Фота БелТА.

**У Віцебску зноў шматлюдна, цёпла і весела — паўночная сталіца прымае міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Свята традыцыйнае, але кожны раз асаблівае. Нязменная традыцыя фестывалю — удзел Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця.**

«Вось і наступіў гэты доўгачаканы ліпеньскі вечар. Мы адкрываем Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Фестываль, які стаў цэлай эпохай, — прывітаў сяброў свята, жыхароў і гасцей Віцебска кіраўнік дзяржавы. — Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення» — так мы вызначылі філасофію гэтага фестывалю. І яна мае глыбокія карані».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што тут, на маляўнічым беразе Дзвіны, ужо 1050 гадоў існуе горад, які мы сёння па праве завём нашай культурнай сталіцай. «Нешта ёсць у гэтым кутку Беларусі, што на працягу стагоддзяў натхняла на стварэнне шэдэўраў выяўленчага мастацтва, унікальных архітэктурных аб'ектаў, вялікіх літаратурных і музычных твораў, а таксама фестываляў, конкурсаў і мноства іншых творчых праектаў. Стагоддзямі тут стваралася ўнікальная атмасфера. Атмасфера творчага пошуку. Атмасфера дыялогу цывілізацый. Стагоддзямі тут перасякаліся гандлёвыя шляхі, злучаючы ўсход і захад, поўнач і поўдзень. Гэты горад удзячна ўбіраў новыя ідэі і павевы. І дзякуючы гэтаму развіваўся. Таму і гісторыя нашага форуму пачалася менавіта тут — у горадзе праслаўленых на ўвесь свет людзей, чый прафесійны шлях прайшоў праз яго майстэрні», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што Віцебск стаў творчай радзімай сапраўдных геніяў: «Калі мы чуем пра яго, уяўляем манументальныя партрэты і скульптуры Азгура, незвычайна жывыя выявы пэндзля Рэпіна, Пэна, Малевіча. Мы глядзім на гарадскія краявіды Віцебска вачыма Шагала, які маляваў любімы горад усё сваё жыццё, нават знаходзячыся за тысячы кіламетраў ад яго. Думаючы пра гэты горад, мы ўспамінаем Лагіна, які падарыў савецкім дзецям казачнага героя — Хатабыча; напяваем мелодыю «Дарогі на Берлін» — песні, напісанай кампазітарам Фрадкіным за год да Вялікай Перамогі. Мы шануем памяць таленавітага военачальніка Івана Люднікава, які кіраваў аперацыяй па вызваленні Віцебшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ганарымся нобелеўскім лаўрэатам Жарэсам Алфёравым, які нарадзіўся ў горадзе на Дзвіне і стаў легендай у сусветнай навуцы».

Прэзідэнт падкрэсліў, што, гаворачы аб Віцебску, мы ўспамінаем і нашых сучаснікаў — плеяду артыстаў, без якіх ужо не ўяўляем нашага фестывалю. «Сёння гэты фестываль аб'ядноўвае людзей розных пакаленняў, рэлігій і культур — сапраўдных знаўцаў мастацтва з самымі рознымі перавагамі — ад авангарду да класікі. Але галоўнае, ён стаў сямейным святам, святам традыцыйных каштоўнасцяў. Тут жыхары і нашы госці сапраўды могуць адпачыць душой», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

### «Фестываль выйшаў за геаграфічныя рамкі славянскага брацтва»

«Дарагія сябры! Славянская душа бязмежная ў сваёй адкрытасці свету. Таму наш фестываль даўно выйшаў за геаграфічныя рамкі славянскага брацтва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што цяперашні форум сабраў аднадумцаў з больш як чатырох дзясяткаў краін: ад Расіі да Індыі, ад Кітая да Калумбіі.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што сёлета ўпершыню на «Славянскім базары» прысутнічаюць міністры культуры і творчыя калектывы з краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва — цяпер ужо і нашай арганізацыі. «Гэта знакавая падзея ў жыцці краіны. Мы далучыліся да супольнасці дзяржаў, за якімі будучыня. Будучыня развіцця чалавецтва на прынцыпах раўнапраўя, павагі і стваральнай працы. Па крайняй меры, сёння ў ШАС пануе такі дух. Ужо заўтра мы правядзём Дзень нацыянальных культур краін ШАС. Няхай ён стане сімвалічным пачаткам нашага сумеснага шляху да агульных мэт. Мэт, якія згуртавалі больш чым палову насельніцтва планеты — людзей, якім блізкая і зразумелая філасофія нашага фестывалю. У ёй — ключ да міру і ўзаемаразумення, які нам даюць людзі мастацтва, таленавітыя людзі», — адзначыў беларускі лідар.

### «Славянскі базар» — гэта час трыумфу дзеячаў культуры»

Звяртаючыся да гасцей фестывалю, арганізатараў і артыстаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што адкрыццё «Славянскага базару ў Віцебску» — гэта заўсёды час трыумфу дзеячаў культуры, чыя творчасць аб'ядноўвае краіны і народы. «І як бы хтосьці не спрабаваў прыўменшыць значэнне нашага фестывалю — нічога не атрымаецца. Ён грыміць на ўсю планету», — заўважыў беларускі лідар.



Фота БелТА.

По традыцыі Аляксандр Лукашэнка ўручыў галоўную прэмію фестывалю «Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення». Сёлета ўладальнікам прэміі стаў народны артыст Расіі Грыгорый Лепс. Аляксандр Лукашэнка таксама ўзнагародзіў прэміяй Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2023—2024 гады пераможцаў і лаўрэатаў, якія ўнеслі значны ўклад ва ўмацаванне дружбы паміж народамі Беларусі і Расіі.

СТАР. 2



Актуальна

## Беларуская мадэль дашкольнай адукацыі: якасць, даступнасць, адказнасць

### У нашай краіне амаль 90 працэнтаў дзяцей ад года да шасці атрымліваюць дашкольную адукацыю



**Некалькі гадоў таму на Рэспубліканскім педагагічным савеце Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў беларускую дашкольную адукацыю і падкрэсліў, што ахоп ёю дзяцей ва ўзросце ад трох до шасці гадоў не мае аналагаў у свеце. І хоць дашкольная адукацыя ў Беларусі не з'яўляецца абавязковай, тым не менш большасць нашых дзетак, да таго як пайсці ў школу, наведваюць дзіцячыя садкі. Яшчэ адзін немалаважны нюанс: у многіх краінах замежжа навучанне і выхаванне малых да трох гадоў знаходзіцца пад патранатам сацыяльных ведамстваў, сістэмы аховы здароўя і інш. У нас гэтым займаецца Міністэрства адукацыі. Наколькі сур'ёзна, адказна і паспяхова — гавораць прыведзеныя вышэй факты. А за падрабязнасцямі мы звярнуліся да намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення — начальніка аддзела дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі кандыдата педагагічных навук Альбіны ДАВІДОВІЧ.**

СТАР. 3

Разумныя грошы

## КАБ ФІНАНСЫ НЕ СПЯВАЛІ РАМАНСЫ

### Як зарабіць шмат грошай і не страціць ужо назапашанае?

**Як звычайна, вакол прымнажэння грошай шмат нявызначанасцяў, некаторыя варыянты інвеставання сталі ўжо недаступныя, але з'явіліся новыя (напрыклад, дэпазіты ў юанях). Мы спыталі ў экспертаў, дзе цяпер выгадна захоўваць грошы і што рабіць з заначкай пяці або 50 тысяч «баксаў» у эквіваленце.**

Адукаваныя людзі загадзя плануюць свае фінансавыя патокі, размяркоўваючы іх па перспектыўных кірунках, тым самым забяспечваючы сабе нябеднае жыццё. Адзін вядомы фінансіст казаў: «Ніколі не ўкладвайце грошы ў ідэю, якую вы не можаце растлумачыць на пальцах». Што сёння можа прынесці нам рэальную выгаду і ў якім выглядзе лепш захоўваць свае грошы?

### Не нашы «паперкі»

Набыццё замежнай валюты — адзін з самых зразумелых інструментаў. Калі фінансавыя магчымасці абмежаваныя ў выкарыстанні іншых спосабаў захавання і прымнажэння грошай, тады валюта з'яўляецца класічным кансерватыўным спосабам зберажэння, тлумачыць **фінансавы кансультант Дзіяна КУЗНЯЦОВА.**

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Германія не зможа цалкам аднавіць прамысловасць пасля спаду



Прамысловы сектар Германіі не зможа поўнасцю пераадолець наступствы спаду апошніх гадоў і вярнуцца да паказчыкаў да 2019 года, паведамляе ТАСС са спасылкай на даследаванне агенцтва Bloomberg.

Паводле даных, атрыманых у выніку даследавання, поўнае ўзнаўленне прамысловага сектара краіны пасля пандэміі і нядаўняга энергетычнага крызісу немагчыма. Варта чакаць цыклічнае аднаўленне прамысловасці па меры змякчэння грашова-крэдытнай палітыкі і аднаўлення попыту. Аднак, па меркаваннях экспертаў, вяртання да паказчыкаў, якія былі да 2019 года, не здарыцца.

Адзначаецца, што сярэднегадавы тэмп прыросту патэнцыяльнай валавой дабаўленай вартасці ў прамысловым сектары ў мінулым годзе знізіўся да 0,5 працэнта (у 2019 годзе — 1,5 працэнта), што можа прывесці да дэфіцыту вытворчага патэнцыялу.

По інфармацыі агенцтва Bloomberg, Федэральны банк Германіі прагназуе эканамічны рост краіны на 0,3 працэнта ў 2024 годзе, заяўляючы, што ўздым працягваецца. Аднак аднаўленне прамысловага сектара застаецца марудным, апошнія звесткі сведчаць аб зніжэнні аб'ёмаў прамысловай вытворчасці.

ISSN 1990 - 763X

### Суд Эквадора палічыў парушанымі правы... ракі



Эквадорскі суд пастанавіў, што забруджванне навакольнага асяроддзя парушае правы Мачангары, ракі, якая працякае праз сталіцу краіны, горад Кіта. Падставай для такога рашэння стала Канстытуцыя дзяржавы, дзе зацверджаны «правы прыродных элементаў, такіх як рэкі». Мэрыя сталіцы ў сваю чаргу падала апеляцыю на пастанову суда. Аднак да яе разгляду ўрад павінен прадставіць план па ачыстцы ракі. А эколагі ўжо назвалі судовы вердыкт «гістарычным».

Як высветлілася, Кіта, горад з насельніцтвам у 2,6 мільёна чалавек, сістэматычна скідае адходы і забруджвальныя рэчывы ў Мачангару, якая бярэ свой пачатак у Андах. Ачыстка сцёкавых вод практычна не вядзецца, і рака нясе тоны адходаў. Па ацэнках спецыялістаў, сярэдні ўзровень кіслароду ў рацэ складае 2 %, што не спрыяе жыццядзейнасці флоры і фаўны.

Дарэчы, у некаторых раёнах Лацінскай і Паўночнай Амерыкі жыхары маюць канстытуцыйнае права на чыстае навакольнае асяроддзе, але Эквадор — адна з нямногіх краін, якія прызнаюць права прыродных элементаў не падвяргацца дэградацыі або забруджванню.

### КОРАТКА

- **Сёлета першы мільён тон збожжа намалацілі амаль на два тыдні раней, чым у 2023-м.**
- Чырвоны ўзровень небяспекі з-за спякоты аб'яўлены ў Беларусі на 13 ліпеня.
- **Ратавальнікі правядуць па ўсёй краіне рэйды па папярэджанні гібелі людзей на вадзе.**
- Грамадзянам Беларусі, якія жывуць у РФ, плануюць даць права ўдзельнічаць у мясцовых выбарах.
- **У Беларусі да кастрычніка адкрыецца сем новых вытворчасцяў па выпуску драўляных домакамплектаў.**
- Стылізаваны ліхтар да 100-годдзя органаў гандлю ўстанавілі ў Брэсце.

Спажывец

## ПРАЎДА І МІФЫ АБ ПАЎФАБРЫКАТАХ

### У Год якасці мы задалі навукоўцам нязручныя пытанні аб тым, што «ўнутры» магазіннай пельмешкі або катлеткі



**Замарожаныя пельмені, гатовыя катлеты, каўбаскі, мітболы, блінцы ва ўпакоўцы і іншыя паўфабрыкаты — мабыць, самыя спрэчныя з пункту гледжання дыетолагаў ды і спажыўцоў прадукты. З аднаго боку, іх прынята лічыць некарыснымі пры частым спажыванні, з другога — яны сапраўдная панацэя для самых розных катэгорый людзей. Дык есці ці не есці? Наколькі бяспечная гэтая прадукцыя для здароўя?**

— Паўфабрыкаты — да іх адносяцца пельмені і катлеты, каўбаскі, блінцы, піца і г. д. — выпускаюцца як замарожанымі, так і астуджанымі, — тлумачыць **загадчыца аддзела тэхналогій мясных прадуктаў РУП «Інстытут мяса-малочнай прамысловасці», кандыдат сельскагаспадарчых навук Святлана ГАРДЫНЕЦ.** — Выпускаюцца яны як кулінарыямі, так і буйнымі і невялікімі мясаперапрацоўчымі прадпрыемствамі. Замарожаныя паўфабрыкаты выпрацоўваюць у асноўным мясакамбінаты. Вытворчасць такой прадукцыі з году ў год расце, як і спажывецкі попыт: інтэнсіўны рытм жыцця не заўсёды дазваляе сучаснаму чалавеку знайсці час на прыгатаванне ежы, скажам так, «з нуля». У сваю чаргу, інстытут увесь час пашырае гэтую лінейку прадукцыі.

СТАР. 8

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» СТАЎ СЯМЕЙНЫМ СВЯТАМ, СВЯТАМ ТРАДЫЦЫЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета прэмія прысуджана аўтарскаму калектыву ў складзе галоўнага архітэктара «Белдзяржпраекта» Віктара Скробата, мастака-манументаліста, члена Беларускага саюза мастакоў Андрэя Пяткевіча, дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Аляксандра Храмога — за стварэнне музея ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь». Лаўрэатам прэміі стаў таксама пазаштатны аўтар Выдавецкага дома «Звязда» Уладзімір Ліхадзедаў за стварэнне і рэалізацыю гісторыка-асветніцкага праекта «Бацькаўшчына», выданне аўтарскіх кніг-альбомаў. Прэмія прысуджана таксама гендырэктару навукова-творчай установы культуры Краснадарскага края «Кубанскі казачы хор» Віктару Захарчанку за стварэнне цыкла песень «Беларусь», «Русь», «Цераз рэчаньку».

«Уручаем узнагароду самаму юнаму таленту — пераможцу дзіцячага песеннага конкурсу, маленькай зорачцы, якой яшчэ толькі трэба будзе заззяць на музычным небасхіле», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Сёлета ўладальніцай Гран-пры XXII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу стала прадстаўніца Узбекістана Ясміна Хусніддзінава.

### «Гісторыя «Славянскага базару» працягваецца і будзе працягвацца»

«Вялікі дзякуй вам — арганізатарам форуму, артыстам, майстрам мастацтваў і ўсім, хто штогод прыязджае ў Беларусь, каб правесці найлепшыя дні фестывальнага лета разам з намі. Дзякуючы вам гісторыя «Славянскага базару ў Віцебску» працягваецца і будзе працягвацца пасля нас разам з нашымі дзецьмі і ўнукамі. Жадаю ўсім бязмежнага натхнення і яркіх творчых ідэй! За кулісамі чакаюць сустрэчы з вамі вашыя любімыя артысты. Чакаюць гэтак жа, як і вы. Давайце разам адпачнём і сэрцам, і душой», — пажадаў усім беларускі лідар.

XXXIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Аляксандр Лукашэнка аб'явіў адкрытым. Па традыцыі адкрыццё свята абвясцілі пазыўныя «Славянскага базару». Свята пачалося!

### За мінулыя гады віцебскі фестываль набыў заслужаны міжнародны аўтарытэт

Прывітальны адрас ад Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна зачытаў намеснік старшыні Урада Расійскай Федэрацыі Аляксей Аврчук.

Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што за мінулыя гады віцебскі фестываль, які праходзіць пад дэвізам «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», набыў заслужаны міжнародны аўтарытэт. Для кампазітараў, спевакоў, паэтаў, мастакоў і артыстаў розных жанраў ён дае добрую магчымасць прадэманстраваць талент і майстэрства, пагутарыць з калегамі і сябрамі, падзяліцца вопытам і творчымі планамі. «Праграма «Славянскага базару» традыцыйна вельмі насычаная і вельмі разнастайная. Адзначу, што ў гэты раз асаблівае месца ў ёй займаюць мерапрыемствы, прымеркаванныя да двух знамянальных юбілеяў — 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў і 25-годдзя падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Хацеў бы адзначыць усіх, хто ўнёс свой уклад у развіццё фестывалю. Упэўнены, што ён паслужыць высокім мэтам духоўнага адзінства і ўзаемаўзбагачэння культур брацкіх славянскіх народаў, будзе садзейнічаць развіццю шматбаковага гуманітарнага супрацоўніцтва», — сказана ў прывітанні. Уладзімір Пуцін пажадаў удзельнікам «Славянскага базару» натхнення і поспехаў, а яго гасцям — яркіх незабыўных уражанняў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*Горад Віцебск.*

# На мове міру і гармоніі гаворыць з намі фестываль

**Кожны новы дзень у святочным Віцебску не падобны на папярэдні. У праграме форуму мастацтваў — дзясяткі мерапрыемстваў самых розных жанраў, і, паверце, паспець на ўсе немагчыма. Мы пастараліся занатаваць самыя яркія і цікавыя моманты чацвёртага фестывальнага дня.**



Фота БелТА.

### Па маршруце «Славянскага экспрэса»

11 ліпеня позна ўвечары адбылася цырымонія ўрачыстага адкрыцця XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Пасля афіцыйнай часткі шасцітысячную залу Летняга амфітэатра запрасілі ў падарожжа на цягніку «Славянскі экспрэс» вядучыя Лера Кудраўцава, Паліна Шуба, Уладзімір Бярэзін і Аляксандр Сярэбранікаў. Гартаючы разам з артыстамі старонкі мінулага, сучаснасці і будучыні нашай суверэннай і незалежнай краіны, жыхары і госці горада на Дзвіне разам з фестывалем гаварылі на мове міру і гармоніі.

Нацыянальным танцавальным каларытам Беларусі і Расіі радавалі нацыянальны балет «Кастрама» і дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі». Неаднойчы выходзіла на сцэну сусветна вядомая і любімая артыстка Таісія Павалій, разам з хорам яна выканала песню на ўкраінскай мове. Мія Бойка і Міхаіл Шуфуцінскі даказалі сваёй кампазіцыяй, што артысты розных пакаленняў могуць паспяхова тварыць разам.

Адным з прыпынкаў фестывальнага цягніка стала гістарычная станцыя, на якой гледачы разам з салістамі Марыінскага тэатра, Русланам Аляхно і Вікторыяй Алешка стоячы аддавалі даніну памяці героям-вызваліцелям, дзякуючы несмяротнаму подзвігу якіх 80 гадоў таму Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Чырвонай ніткай праз святочны канцэрт прайшла тэма 30-годдзя інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне, ёй прысвяціла песню «Наша заўтра» беларуская артыстка Ганна Благава. Значная падзея для ўсіх беларусаў — палёт у космас першай жанчыны-касманаўткі ў гісторыі суверэннай Беларусі Марыны Васілеўскай — таксама знайшла сваё адлюстраванне на сцэне Летняга амфітэатра ў касмічным харэаграфічным нумары. Сёлета брацкія краіны Беларусь і Расія адзначаюць 25-годдзе з дня падпісання пагаднення аб будаўніцтве Саюзнай дзяржавы. Свой музычны падарунак з гэтай нагоды падарылі беларуска Алена Ланская і расіянін Аляксандр Елаўскіх.

Гэтым вечарам выходзілі на сцэну Дзіма Білан, Алег Газманаў, Аляксандр Буйноў, Люся Чабоціна, Ані Лорак, Грыгорый Лепс, ВІА «Песняры», Аўра, Аляксандр Саладуха. Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры» гасцінна і па-беларуску запрасілі ўсіх песняй «Прыязджайце да нас у Беларусь!».

Традыцыйна неба над горадам расфарбаваў святочны салют.

### ГРАН-ПРЫ ЕДЗЕ ВА УЗБЕКІСТАН

Раскрылася інтрыга XXII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2024». Галоўную ўзнагароду — Гран-пры — атрымала 10-гадовая Ясміна Хусніддзінава з Узбекістана. У першы конкурсны дзень яна выступіла пад нумарам «13» з кампазіцыяй «Voila», якая прынесла дзяўчынцы 69 балаў з 70 магчымых. У другі дзень Ясміна выканала песню на роднай мове «Ручаёк», па выніках двух конкурсных этапаў юная зорачка набрала 139 балаў. З такім вынікам завяршыўся конкурс і для прадстаўніцы Мальты Каі, якая таксама атрымала 139 балаў, але журы аддало перавагу Ясміне. Вакалістка атрымала дыплом, запаветную статуэтку і прэмію ў памеры пяці тысяч долараў.

Прадстаўніца Беларусі Злата Ярашэвіч у першы конкурсны дзень выканала кампазіцыю «Golden Slumbers», журы ацаніла вакалістку ў 67 балаў. У другі конкурсны дзень дзяўчына выканала песню на роднай мове «Сонца Беларусі» і атрымала 69 балаў. З агульным вынікам 136 балаў таленавітая беларусачка атрымала III прэмію конкурсу, тысячу долараў і спецыяльны прыз Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Такога ж прыза ўдастоены Кірыл Усаў з Расіі. Спецыяльная прэмія Ігара Лучанка сёлета прысуджана адной з самых маленькіх удзельніц конкурсу Марыі Награісаловіч з Босніі і Герцагавіны.

### КАРАГОД КУЛЬТУР НА ВІЦЕБСКАЙ ЗЯМЛІ

4 ліпеня Беларусь афіцыйна стала членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. На гэту значную і ганаровую для нашай краіны падзею не мог не адгукнуцца «Славянскі базар». Учора ў рамках фестывалю прайшоў першы ў гісторыі дзяржавы Дзень нацыянальных культур краін — членаў ШАС.

Фота Аляксандры ГВОЗДЗЕВАЙ.



Мерапрыемства, якое прайшло ў Віцебску ўпершыню і мае для Беларусі вялікае значэнне, пачалося з сустрэчы міністраў культуры краін, якія ўваходзяць у арганізацыю, у міжнародным прэс-цэнтры. У ёй узялі ўдзел прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Азербайджана, Узбекістана, Таджыкістана, Пакістана, Кыргызстана, КНР, Казахстана, Ірана і Індыі. Прыбыў у фестывальны Віцебск і генеральны сакратар ШАС Чжан Мін.

«Сёння я ўжо на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прымаю асабісты ўдзел у сустрэчы міністраў культуры краін — удзельніц ШАС, арганізатарам якой з'яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Гэта першае мерапрыемства нашай арганізацыі, якое праводзіцца ў Беларусі пасля яе афіцыйнага ўступлення ў сям'ю ШАС. Мы перакананы, што частае ўзаемадзеянне паміж беларускім бокам і членамі сям'і ШАС сыграе важную ролю ва ўмацаванні ўзаемаразумення і паскарэнні інтэграцыі беларускага боку ў працэсе супрацоўніцтва ў рамках ШАС, закладзе трывалую аснову для далейшага развіцця ўзаемадзеяння. Менш чым праз 10 дзён пасля свайго афіцыйнага ўступлення ў ШАС Беларусь ужо ў поўнай меры прадэманстравала тое вялікае значэнне, якое яна надае супрацоўніцтву ў рамках арганізацыі», — адзначыў Чжан Мін.

Міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч расказаў, як цесна Сінявокая супрацоўнічае з брацкай Расіяй у сферы культуры, і акрэсліў перспектывы і прапановы для такога ж узаемадзеяння з краінамі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Беларусь гатова прапанаваць адораным маладым людзям з краін ШАС магчымасці прафесійнай падрыхтоўкі і стажыровак у айчынных ВНУ, каледжах, удзел у творчых конкурсах, фестывалях і пленэрах. У сваю чаргу мы заўсёды гатовы падтрымаць новыя творчыя ініцыятывы ў рамках ШАС, такія як прапанаванае Расіяй адраджэнне конкурсу песні «Інтэрбачанне» і іншыя праекты, якія з'яўляюцца ў нашых сяброў і партнёраў. Укладам Беларусі ў скарбонку такіх ініцыятыў стане Мінскі міжнародны маладзёжны культурны форум «Традыцыі дзеля будучыні», які пройдзе ў 2025 годзе», — падкрэсліў міністр.

Пасля сустрэчы дэлегацыі ўдзельнікі Дня нацыянальных культур наведалі Музей-сядзібу знакамітага мастака Ілы Рэпіна «Здраўнёва», дзе змаглі пазнаёміцца з мастацкай спадчынай Беларусі і, вядома, гасціннасцю нашага народа. Таксама прадстаўнікі краін, якія ўваходзяць у ШАС, усклалі кветкі да Вечнага агню на мемарыяльным комплексе ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў.

Адразу з цырымоніі адкрыцця свята пачала работу пляцоўка на плошчы Перамогі, дзе дзесяць краін — удзельніц ШАС прэзентавалі свой культурны патэнцыял. Маштабны павільён 10 на 30 метраў сімвалічна зрабілі агульным для ўсіх дзяржаў, дзе кітайцы і казахі, беларусы і таджыкі, азербайджанцы і іранцы і іншыя народы былі пад адным дахам, як у адной вялікай сям'і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

### 25 ГАДОЎ ПОРУЧ

Сёлета спаўняецца 25 гадоў з дня падпісання пагаднення аб будаўніцтве Саюзнай дзяржавы. Не першы год у рамках «Славянскага базару» праходзіць не адзін, а некалькі Дзён Саюзнай дзяржавы. Старт урачыстым мерапрыемствам на цырымоніі адкрыцця фестывалю дало ўручэнне Прэмій СД у галіне літаратуры і мастацтва за 2023—2024 гады. Учора Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Дзямідаў, а таксама дэлегацыі Беларусі і Расіі ўсклалі кветкі да Вечнага агню, аддаўшы даніну памяці героям, якія цаной свайго жыцця заваявалі мір і незалежнасць.

У Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава адбыўся круглы стол «Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі: 25 гадоў умацавання культурных і духоўных традыцый», у якім узялі ўдзел Дзмітрый Мезенцаў, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Пярцоў, міністр інфармацыі Марат Маркаў, намеснік міністра культуры Расійскай Федэрацыі Андрэй Малышаў і іншыя ганаровыя госці, а таксама артысты і культурныя дзеячы.

«Мы павінны выконваць сёння дзве задачы, і гэтыя задачы стаяць перад намі зусім канкрэтна. Мы абавязаны дамінаваць у сваёй інфармацыйнай прасторы. Я ў дадзеным выпадку кажу аб прасторы Саюзнай дзяржавы. А каб дамінаваць, неабходна ствараць новыя інструменты, якія будуць замяняць у тым ліку і тыя, што нам навязвалі на працягу многіх гадоў», — сказаў міністр інфармацыі Беларусі Марат Маркаў. Ён падкрэсліў, што работа па стварэнні такіх інструментаў будзе праводзіцца падчас фарміравання агульнага медыяхолдынга Саюзнай дзяржавы.

На Пушкінскай плошчы свята народнай культуры і традыцый у фармаце open-air сабрала найлепшыя беларускія і расійскія калектывы, якія на працягу дня радавалі гараджан і гасцей паўночнай сталіцы вакальнымі і харэаграфічнымі нумарамі. На адкрытую сцэну ў гістарычным сэрцы Віцебска выйшлі ансамбль песні і танца «Белагор'е», народны ансамбль Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных, ансамбль казацкай песні і пляскі «Разгуляй» і іншыя. Нават шквалісты лівень, які зусім нечакана ўчора абрушыўся на фестываль, не паўплываў на бадзёры настрой і атмасферу адзінства дзвюх краін.

Увечары з аншлагам прайшоў гала-канцэрт «Народнае брацтва даражэйшае за ўсякае багацтва». Аб тым, наколькі важна ў такі няпросты час быць поруч і крочыць у развіцці разам, на мове музыкі расказалі Зара, Міхаіл Турэцкі і арт-група «Хор Турэцкага», Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры», Вікторыя Алешка і іншыя.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Глабальны кантэкст

# Ад міжурадавых гандлёвых пагадненняў да правядзення кінафестывалю

## Новыя ініцыятывы Беларусі на Парламенцкім форуме БРІКС

**У другі дзень X Парламенцкага форуму БРІКС у Санкт-Пецярбургу кіраўнікі абедзвюх палат беларускага парламента выступілі з ініцыятывамі па тэме пленарных пасяджэнняў у пашыраным фармаце.**



## Выкарыстоўваць практычны вопыт усіх для пераадолення крызісу

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка ўдзельнічаў у пленарным пасяджэнні ў пашыраным фармаце на тэму «Роля парламентаў у процідзеянні фрагментацыі шматбаковай гандлёвай сістэмы і пераадоленні пагроз, звязаных з наступствамі глабальных крызісаў».**

Выступаючы на пасяджэнні, Ігар Сергяенка адзначыў: «Нас многае звязвае — у першую чаргу імкненне да справядлівага светаўладкавання, непадзельнай бяспекі і ўзаемавыгаднага міжнароднага супрацоўніцтва, якое ў роўнай ступені адпавядае інтарэсам кожнага з удзельнікаў аб'яднання». На думку спікера, парламенты як выразнікі інтарэсаў сваіх выбаршчыкаў нясуць асаблівую адказнасць за ўстараненне сучасных выклікаў і пагроз. Бо разбурэнне сістэмы міжнароднага права і глабальныя крызісы, штучна створаныя асобнымі краінамі для захавання сваёй гегемоніі, сталі ўяўляць рэальную пагрозу бяспецы існавання ўсяго чалавецтва. Сітуацыю можна змяніць, толькі аб'яднаўшы намаганні з аднадумцамі. Менавіта таму Рэспубліка Беларусь стала дзясятым паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і падала заяўку на ўступленне ў БРІКС. Ігар Сергяенка выказаў надзею, што імкненне Беларусі стаць паўнацэнным удзельнікам гэтага прагрэсіўнага аб'яднання будзе гэтак жа аднадушна падтрымана ўсімі краінамі, якія ў яго ўваходзяць.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў прапанаваў максімальна выкарыстоўваць існуючы практычны вопыт і патэнцыял для вырашэння задач, што стаяць перад БРІКС, па пераадоленні наступстваў глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу, павышэнню жыццёвага ўзроўню насельніцтва і развіццю высокатэхналагічнай вытворчасці. У сувязі з гэтым ён вылучыў некалькі ключавых кірункаў узаемадзеяння. Першае — вырашэнне пытанняў аб раўнапраўным членстве краін ва ўніверсальных і рэгіянальных міжнародных арганізацыях — без якіх-небудзь абмежаванняў. «Разам з тым мы гатовы рабіць усё магчымае, каб такія структуры забяспечвалі ў роўнай ступені інтарэсы ўсіх удзельнікаў, а не асобных краін або вузкага кола дзяржаў», — сказаў Ігар Сергяенка.

Другі кірунак — пашырэнне ўзаемадзеяння па фарміраванні і развіцці міжнародных арганізацый, якія садзейнічаюць эканамічнаму, фінансаваму, гуманітарнаму і іншаму супрацоўніцтву, забеспячэнню непадзельнай бяспекі. «Толькі так мы зможам эфектыўна процідзейнічаць фарміраванню блокаў у сусветнай эканоміцы і ўзнікненню гандлёвых войн, росту колькасці гарачых канфліктаў і іх лакалізацыі, — падкрэсліў спікер. — Трэцяе — развіццё двухбаковай і шматбаковай дагаворна-прававой базы праз ратыфікацыю міждзяржаўных і міжурадавых пагадненняў, якія маюць на мэце стварэнне празрыстых, справядлівых і ўзаемавыгадных умоў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва».

«Чацвёрты кірунак — распрацоўка міжнародных правіл і стандартаў, якія ўніфікуюць патрабаванні пры ажыццяўленні канкрэтных відаў дзейнасці, і іх імплементацыя ў нацыянальнае заканадаўства. Беларусь мае ў гэтым немалы вопыт, знаходзячыся ў іншых інтэграцыйных аб'яднаннях. Значную цікавасць для нашай краіны ўяўляюць агучаныя ў рамках БРІКС ініцыятывы, накіраваныя на развіццё разліковай плацежнай сістэмы, новых падыходаў да фарміравання рэзервовых валют, пашырэнне супрацоўніцтва ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Пяты кірунак — умацаванне міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

Асобна Ігар Сергяенка адзначыў значнасць ролі заканадаўчых органаў у захаванні суверэнітэту і супрацьдзеянні знешняму ціску, пачынаючы ад нелегітымных санкцый, іншых абмежавальных мер і заканчваючы дэструктыўным інфармацыйным уздзеяннем. У мэтах абароны ад названых негатыўных фактараў у Беларусі прыняты шэраг законаў, якія на практыцы даказалі сваю эфектыўнасць. «Мы гатовы падзяліцца сваім вопытам у гэтай сферы, — сказаў Ігар Сергяенка. — Мы таксама гатовы рабіць усё неабходнае для забеспячэння глабальнай харчовай бяспекі».

«Па нашым перакананні, міжнародныя парламенцкія структуры павінны адыгрываць істотную ролю ў працэсе фарміравання аб'яднальнага парадку дня і пошуку кропак спалучэння адпаведных ініцыятыў», — сказаў Ігар Сергяенка. Ён заклікаў прадстаўнікоў прысутных на форуме дзяржаў унесці свой пасільны ўклад у рэалізацыю беларускай ініцыятывы па распрацоўцы праграмнага дакумента — Хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі.

## Фарміраваць ідэйна-светапоглядную аснову

**Кіраўнік беларускай парламенцкай дэлегацыі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава ўчора ўдзельнічала ў пленарным пасяджэнні ў пашыраным складзе на тэму «Міжкапарламенцкае супрацоўніцтва ў гуманітарнай і культурнай сферы».**

У сваім выступленні Наталля Качанава адзначыла, што Беларусь, несумненна, зацікаўлена ў плённым супрацоўніцтве з усімі ўдзельнікамі Аб'яднання ва ўказаных сферах. Паводле яе слоў, сітуацыя ў свеце мяняецца з кожным днём, і асабліва хутка развіваюцца сучасная сістэма адукацыі, навука і тэхналогіі.

«Толькі калі стратэгічныя высновы дакладныя, стратэгічнае планаванне навукова абгрунтаванае, можна ўтрымліваць перадавыя пазіцыі ў глабальнай эканамічнай канкурэнцыі. У імя прагрэсіўнай будучыні нашых народаў і дзяржаў галоўнай рухальнай сілай развіцця мы абавязаны зрабіць інавацыі», — сказала яна. У рамках рэалізацыі гэтага пасылу беларускі бок прапануе развіваць практыку студэнцкага і выкладчыцкага абменаў, узаемнага ўдзелу ў навуковых мерапрыемствах, семінарах, сімпозіумах, праводзіць конкурсы навукова-тэхнічных праектаў, садзейнічаць сумеснай навукова-даследчай і экспертнай дзейнасці. Гэта дазволіць сінхранізаваць намаганні ўсіх удзельнікаў аб'яднання на гэтым кірунку.

Наталля Качанава агучыла таксама надзённае пытанне гуманітарнага парадку дня — дыскрымінацыю ў спорце, якая ператварылася ў інструмент пакарання палітычна непажаданых — суверэнных краін, якія праводзяць самастойную ўнутраную і знешнюю палітыку ў інтарэсах уласных народаў. Такога ў гісторыі алімпійскага руху не было ніколі. «Як вядома, толькі ў сумленнай барацьбе нараджаецца надзея на перамогу. У сувязі з гэтым мы вітаем Гульні БРІКС і шчыра дзякуем усім арганізатарам і ўдзельнікам», — сказала яна і выказала ўпэўненасць, што традыцыя іх правядзення будзе спрыяць адраджэнню сапраўднага духу алімпійскага руху і ўвасабленню ў жыццё яго галоўнага прынцыпу: спорт — па-за палітыкай.

«Нам неабходна больш актыўна развіваць культурны турызм, запрашаць адзін аднаго да ўдзелу ў міжнародных фестывалях, якія праводзяцца ў нашых краінах, арганізоўваць тэатральныя гастролі і кніжныя кірмашы», — сказала спікер і прапанавала правесці Дні нацыянальных культур краін — удзельніц БРІКС-плюс у рамках «Славянскага базару», а таксама арганізаваны ў гэтыя ж дні прэс-тур.

У наступным годзе краіны БРІКС плануюць стварыць сваю кінаакадэмію і заснаваць штогадовую кінапрэмію. Для Беларусі будзе вялікім гонарам прымаць адзін з такіх кінафестываляў, падкрэсліла Наталля Качанава.

Не менш важным, на яе думку, уяўляецца супрацоўніцтва краін — удзельніц аб'яднання па лініі жаночых і маладзёжных аб'яднанняў, грамадскіх рухаў працоўных, экалагічнай, рэгіянальнай і экспертнай дыпламатыі. Такія фарматы дазволяць дынамічна прасоўваць аб'яднаўчы парадак дня БРІКС і больш поўна абменьвацца нацыянальным вопытам.

Таксама Наталля Качанава выказала поўную падтрымку ініцыятыве расійскіх калег аб актыўным удзеле ў рабоце аб'яднання жанчын-парламентарыяў і сустрэчы маладых парламентарыяў краін — удзельніц БРІКС на палях Парламенцкага форуму. «Лічым перспектыўным рэгулярны форум маладых парламентарыяў БРІКС-плюс. Адным з топавых культурна-адукацыйных маладзёжных праектаў можа стаць маладзёжны маршрут па памятных мясцінах нашых народаў», — сказала яна.

«Цывілізацыйная місія парламентарыяў у тым, каб фарміраваць ідэйна-светапоглядную аснову і культуру жыцця ў новым, постглабальным свеце, быць той пуцяводнай зоркай, якая павядзе за сабой да святла ў бездані татальнай турбулентнасці, нявызначанасці і напружанасці сучаснага свету», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

* * *

Таксама Наталля Качанава і Ігар Сергяенка на палях форуму правялі шэраг двухбаковых сустрэч са сваімі калегамі-парламентарыямі іншых краін.

**Паводле прэс-службаў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.**

# Беларуская мадэль дашкольнай адукацыі: якасць, даступнасць, адказнасць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Альбіна Леанідаўна, якія найбольш актуальныя задачы стаяць сёння перад сферай дашкольнай адукацыі?***

— У Год якасці ў сістэме дашкольнай адукацыі асноўную ўвагу мы якасці і аддаём. Якасці адукацыйных паслуг, адукацыйнага працэсу і адпаведных умоў. Пад умовамі разумеем не толькі забяспечанасць матэрыяльна-тэхнічнай базай, аснашчанасць дзіцячых садкоў сучаснымі сродкамі навучання, дзе, дарэчы, асаблівы акцэнт робім на сучасным надворным абсталяванні. Але ж галоўнай мэтай для нас было і застаецца забяспечыць установы дашкольнай адукацыі кваліфікаванымі педагагічнымі кадрамі і якаснымі вучэбнымі праграмамі і выданнямі.

***— Цікава ведаць, што ўключае ў сябе сучасная вучэбная праграма для дашкалят.***

— Вучэбную праграму дашкольнай адукацыі і адукацыйны стандарт дашкольнай адукацыі мы абнавілі ў 2022 годзе, тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі — у 2023-м. У чым асноўныя змены? Безумоўна, гэта перагляд зместу дашкольнай адукацыі з улікам сучасных тэндэнцый.

Праграма комплексная і ўключае ў сябе шэраг адукацыйных абласцей. Гэта «Фізічная культура», «Дзіця і грамадства», «Элементарныя матэматычныя ўяўленні», «Дзіця і прырода», «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», «Падрыхтоўка да навучання грамаце», «Выяўленчае мастацтва», «Музычнае мастацтва», «Мастацкая літаратура».

У мэтах удасканалення работы па патрыятычным выхаванні, фарміраванні ў дзяцей дашкольнага ўзросту традыцыйных каштоўнасных установак і адпаведных кампетэнцый у адукацыйным стандарце і вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі абноўлены змест раздзела «Сацыяльна-маральнае і асобаснае развіццё». Пачынаючы з сярэдняй групы (ад чатырох да пяці гадоў) у гэты раздзел уключаны новы адукацыйны кампанент «Асновы грамадзянска-патрыятычнай культуры».

***— Ці ўлічваецца ўзрост дзіцяці?***

— Абавязкова. Змест у адукацыйных абласцях прадстаўлены па гадах жыцця: ад нараджэння да аднаго года, ад аднаго да двух гадоў, ад двух да трох гадоў, ад трох да чатырох гадоў, ад чатырох да пяці гадоў, ад пяці да шасці і ад шасці да сямі гадоў з улікам значнасці кожнага перыяду жыцця ў яго развіцці.



***— Згадзіцеся, дзетсадаўцы — асаблівая група, назавём так, вучняў. І падыход да іх патрэбен быць асаблівым. Як з гэтым спраўляюцца педагогі? Хто і што ім дапамагае?***

— Асаблівы падыход патрэбен для дзяцей любога ўзросту. Што датычыцца дапамогі — распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі работы па фарміраванні асноў грамадзянска-патрыятычнай культуры з выхаванцамі і іх бацькамі.

Мы ў прынцыпе актыўна працуем у дадзеным кірунку. Праводзім шэраг тэматычных мерапрыемстваў, прычым на розных узроўнях: абласным, раённым, гарадскім. Гэта акцыі, інфармацыйна-адукацыйныя праекты і конкурсы, дыялогавыя пляцоўкі, дыскусійныя платформы, інфармацыйныя сустрэчы, анлайн-форумы, інтэрактыўныя пляцоўкі, у тым ліку з удзелам прадстаўнікоў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь. Не так даўно, напрыклад, прайшоў рэспубліканскі семінар «Гісторыка-культурная спадчына беларускага народа ў адукацыйнай прасторы дашкольнай адукацыі».

Сёлета пачалася распрацоўка інтэрактыўных дыдактычных гульняў па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту. Адпаведнае навуковае даследаванне праводзіцца Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка. Яшчэ адзін важны аспект у гэтым кірунку — работа ў цесным узаемадзеянні з сем'ямі выхаванцаў.

***— Вучэбныя выданні для дашкольнага выхавання. Які іх спектр, як яны рыхтуюцца і выпускаюцца. І чым прынцыпова адрозніваюцца ад школьных?***

— Сёння ўжо можна казаць аб стварэнні ў Беларусі айчыннай школы навуковых даследаванняў у галіне распрацоўкі вучэбных выданняў па дашкольнай адукацыі. Неабходнасць пабудовы цэласнай адукацыйнай прасторы, у тым ліку на этапе пераходу дзіцяці з установы дашкольнай адукацыі на першую ступень агульнай сярэдняй; навуковага кіравання гэтым працэсам, вырашэння праблемы метадычнага забеспячэння на аснове прынцыпаў сістэматычнага падыходу разглядалася беларускімі навукоўцамі Якавам Каламінскім, Наталляй Старжынскай, Лізаветай Панько, Ірынай Жытко, Раісай Касянюк, Дзінай Дубінінай і іншымі.

Што датычыцца спектра — ён досыць шырокі: дапаможнікі, вучэбныя, вучэбна-метадычныя і вучэбна-наглядныя дапаможнікі, хрэстаматыі.

У 2023 годзе было выдадзена восем найменняў вучэбных выданняў для выхаванцаў старэйшых груп ад пяці да сямі гадоў, шаснаццаць найменняў вучэбных выданняў для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі. У 2024 годзе таксама ўжо выдадзена восем найменняў вучэбных дапаможнікаў вучэбна-метадычнага комплексу «Мае першыя ўрокі». Яшчэ дзесяць найменняў вучэбных выданняў для педагогаў дзіцячых садкоў — у плане выпуску.

## Эксперыменты і інавацыі

***— Апошнія гады ў школах краіны апрабоўвалася некалькі пілотных праектаў. Як ідуць справы з эксперыментамі ў сферы дашкольнай адукацыі?***

— І эксперыментальная, і інавацыйная дзейнасць ажыццяўляецца даволі актыўна. У гэтым годзе, напрыклад, 76 устаноў дашкольнай адукацыі краіны ўдзельнічала ў рэалізацыі чатырох эксперыментальных праектаў, 117 садкоў апрабіравала дзевяць інавацыйных праектаў.

Тэматыка праектаў вельмі разнастайная: логіка-матэматычнае развіццё выхаванцаў старэйшага дашкольнага ўзросту, персанальнае суправаджэнне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, фарміраванне інклюзіўнай адукацыйнай прасторы.

З гэтага года мы пачалі рэалізацыю Праграмы развіцця і ўдасканалення дашкольнай адукацыі на 2024—2025 гады. Мерапрыемствы праграмы прадугледжваюць арганізацыйнае і змястоўнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу, рэсурснае забеспячэнне, удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Асаблівая ўвага — інфармацыйнаму суправаджэнню.

Плануем правесці ў новым фармаце конкурс прафесійнага майстэрства — «Найлепшы педагог установы дашкольнай адукацыі». У ім возьмуць удзел не толькі выхавацелі дашкольнай адукацыі, але і іншыя педагогі дашкольных устаноў, напрыклад кіраўнікі фізічнага выхавання, музычныя кіраўнікі. У цяперашні час распрацоўваецца канцэпцыя конкурсу.

Зменіцца і фармат работы Рэспубліканскага савета кіраўнікоў дашкольнай адукацыі, які возьме на сябе каардынацыю дзейнасці рэгіянальных аб'яднанняў. Яго функцыі значна пашырацца з улікам уваходжання ў структуру Беларускага педагагічнага таварыства.

Планаў і перспектыў развіцця шмат. Работа над удасканаленнем нацыянальнай сістэмы дашкольнай адукацыі не спыняецца ні на дзень.

## Аб будзённым

***— Пагаворым аб тым, што сёння найбольш хвалюе бацькоў. Напрыклад, аб змене графіка работы ўстаноў дашкольнай адукацыі.***

— У нашай краіне на дзяржаўным узроўні ствараюцца ўсе ўмовы для таго, каб дзеці наведвалі ўстановы дашкольнай адукацыі, а іх бацькі мелі магчымасць працаваць. На неабходнасці паглядзець на рэжым работы дзіцячых садкоў і падстроіцца пад бацькоў, завастрыў увагу на сустрэчы з актывам Беларускага саюза жанчын 5 сакавіка 2024 года і кіраўнік нашай дзяржавы.

На заканадаўчым узроўні гэта пытанне ўрэгулявана. Так, пунктам 3 артыкула 139 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі вызначана, што час знаходжання выхаванцаў ва ўстанове адукацыі вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі ў адпаведнасці з запытамі законных прадстаўнікоў выхаванцаў і можа складаць ад двух да сямі гадзін, 10,5 гадзіны, 12 гадзін, 24 гадзіны. Падкрэсліваю, у адпаведнасці з запытамі законных прадстаўнікоў выхаванцаў.

Адзіных прынцыпаў па вызначэнні рэжыму работы няма. Акрамя запытаў бацькоў, заснавальнік вызначае яго з улікам статусу населенага пункта: горад, вёска, аграгарадок, абласны ці раённы цэнтр. Улічваецца наяўнасць у населеным пункце горадаўтваральных прадпрыемстваў, іх рэжыму работы і іншыя нюансы.

На сёння 2908 устаноў дашкольнай адукацыі Беларусі функцыянуюць 10,5 гадзіны, 822 — 12 гадзін, 24 гадзіны працуюць 16 садкоў.

На дадзены момант перад мясцовымі ўладамі пастаўлена задача перагледзець загружанасць дзіцячых садкоў з улікам работы прадпрыемстваў і арганізацый.

***— Якія яшчэ запыты бацькоў знаходзяць станоўчы водгук?***

— У дзіцячых садках ствараюцца ўмовы для адкрыцця і функцыянавання груп кароткачасовага, ад двух да сямі гадзін, знаходжання: сезонныя пляцоўкі, пляцоўкі для гульняў, прагулачныя, групы выхаднога дня, вячэрнія, адаптацыйныя, «матчыны школы» і іншыя.

***— Ці хапае сёння ў краіне ўстаноў, якія рэалізуюць праграму дашкольнай адукацыі?***

— У мінулым годзе ў нас працавала 3750 такіх устаноў, у тым ліку непасрэдна ўстаноў дашкольнай адукацыі — 2795. У іх атрымлівалі дашкольную адукацыю каля 355,7 тысячы выхаванцаў. Згадзіцеся, лічба немалая.

Прывяду яшчэ крыху лічбаў, бо без іх не абысціся. На 1 ліпеня 2024 года адкрыта тры ўстановы на 650 месцаў у Мінскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях, а ўсяго ў 2024 годзе запланавана будаўніцтва 15 садкоў на 3550 месцаў. Яны з'явяцца ў Брэсце, Лепелі, Оршы, Наваполацку, Віцебску, Гомелі, Гродне, Смілавічах, Лагойску, Бараўлянах, Магілёве і Мінску. У наступныя два гады плануецца будаўніцтва яшчэ 23 дзіцячых садкоў.

Что датычыцца хапае ці не хапае... У краіне дзіцячых садкоў дастаткова і нават ёсць свабодныя месцы. Праблема крокавай даступнасці існуе толькі ў мікрараёнах-новабудоўлях, дзе шмат дзетак дашкольнага і школьнага ўзросту. Напружаная сітуацыя ў Мінскім раёне, дзе 2340 дзяцей пакуль не забяспечаны месцамі ў найбліжэйшых садках. Менавіта тут ажыццяўляецца будаўніцтва новых дашкольных устаноў. Часова вырашаем праблему з дапамогай сталічных дзіцячых садкоў, арганізуем падвоз дзяцей да іх. Упэўнена, хутка сітуацыя палепшыцца.

***— Як бацькі змогуць знайсці інфармацыю аб наяўнасці і колькасці свабодных месцаў у дзіцячых садках?***

— Праз інтэрактыўныя карты, якія змяшчаюць спасылкі на ўсе дзіцячыя садкі рэгіёнаў, Мінска, прычым не толькі на інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі, але і на сайтах камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, галоўных упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў.

Як гэта выглядае на практыцы? Адкрываеце інтэрактыўную карту, напрыклад, Мінска і сярод прапанаваных варыянтаў узроўняў адукацыі — дашкольная, агульная сярэдняя, дадатковая — выбіраеце дашкольную адукацыю. Пасля гэтага выбіраеце адміністрацыйны раён сталіцы, умоўна, Маскоўскі. Пры націску на яго абразок адкрываецца адукацыйная сетка ўстаноў дашкольнай адукацыі Маскоўскага раёна. У сетцы можна выбраць дзіцячы садок, размешчаны побач з месцам пражывання ці рэгістрацыі сям'і дзіцяці, месцам работы бацькоў ці навучання старэйшых дзяцей і іншае. Установы дашкольнай адукацыі, у якіх маецца пяць і болей свабодных месцаў, выдзелены на карце зялёным колерам.

Націснуўшы на абразок дзіцячага садка, можна даведацца аб наяўнасці свабодных месцаў у канкрэтных узроставых групах, а пры пераходзе па спасылцы на сайт установы атрымаць больш поўную інфармацыю пра яе.

***— Што патрэбна, каб атрымаць месца ў дашкольнай установе?***

— Па-першае, стаць на ўлік. На жаль, некаторыя бацькі аб гэтым забываюць і потым скардзяцца, што не атрымалі месца непасрэдна ў той установе дашкольнай адукацыі, у якой чакалі.

Пачынаць падрыхтоўку дакументаў для пастаноўкі на ўлік неабходна загадзя. Канкрэтна ўстанавіць тэрмін вельмі складана. Многія бацькі робяць гэта адразу пасля нараджэння дзіцяці, асабліва ў мікрараёнах-новабудоўлях.

Звяртаю ўвагу, што на інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі ў раздзеле «Дашкольная адукацыя» ў рубрыцы «Бацькам дашкольнікаў» размешчана інфармацыя аб тым, як уладкаваць дзіця ў дзіцячы садок.

## Для маладых бацькоў

***— Усё ж такі давайце правядзём невялічкі лікбез для тых, перад кім стаіць задача ўладзіць сваё дзіця ў садок. Як кажуць, раскладзём па палічках.***

— Для пастаноўкі на ўлік аднаму з бацькоў (законнаму прадстаўніку) дзіцяці неабходна звярнуцца ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы па месцы знаходжання ўстановы адукацыі. Як правіла, гэта служба «Адно акно».

Пры звароце прадставіць наступныя дакументы:

— пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу законнага прадстаўніка дзіцяці;

— пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці (пры яго наяўнасці — для дзяцей, якія з'яўляюцца непаўналетнімі замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якім дадзены статус бежанца, дадатковая абарона ці прытулак у Рэспубліцы Беларусь або якія хадайнічаюць аб даванні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь).

Законнаму прадстаўніку будзе прапанавана запоўніць заяву па ўстаноўленай форме, пасля чаго дзіця будзе лічыцца пастаўленым на ўлік для атрымання дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі. Форма заявы аб пастаноўцы на ўлік прадугледжвае ўказанне да трох устаноў дашкольнай адукацыі.

Як згадвалася раней, крытэрыямі выбару могуць выступаць размяшчэнне дзіцячага садка ў зоне пешаходнага доступу, яго блізкасць да месца работы бацькоў альбо месца навучання іншых дзяцей, а таксама від установы адукацыі (дзіцячы садок, санаторны дзіцячы садок, спецыяльны дзіцячы садок і інш.), адпаведная матэрыяльна-тэхнічная база, кадравы патэнцыял і гэтак далей.

А на заканчэнне ў мяне ёсць добрая навіна, якая звязана з пытаннямі падачы дакументаў, — цяпер ажыццяўляюцца мерапрыемствы па пераводзе ў электронную форму адміністрацыйных працэдур па пастаноўцы на ўлік дзяцей у мэтах атрымання імі дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, а таксама выдачы накіравання ва ўстанову адукацыі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# КАБ ФІНАНСЫ НЕ СПЯВАЛІ РАМАНСЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але важна разумець, што купля валюты — гэта спосаб не прымножыць грошы, а дыверсіфікаваць зберажэнні і ў найлепшым выпадку захаваць, але не зарабіць. Долар і еўра схільныя да інфляцыі, як і беларускія рублі, хоць у іх яна іншая. У кароткатэрміновай перспектыве гэта часам не працуе абсалютна. І нават навіна пра тое, што ў чарговы пакет санкцый ЗША трапіла Маскоўская біржа, толькі часова ўстрывожыла расійскіх і айчынных аматараў замежнай валюты.

Фінансавыя аналітыкі тады растлумачылі, што рашэнне спыніць таргі доларам, а следам і еўра (у Расіі), хоць еўрапейскія ўлады не накладвалі ніякіх санкцый на Маскоўскую біржу, нічога не мяняе. Бо курс можа вызначаць Цэнтрабанк РФ, для гэтага біржа не патрэбна. Тым больш на ёй па-ранейшаму гандлююць юанем — на сёння асноўнай валютай расійскага фінансавага рынку. А праз яе лёгка з дапамогай крос-курсаў вызначыць кошт і долара, і еўра.

Па словах экспертаў, усе чуткі аб магчымых праблемах з абменам валюты, яе даступнасцю не маюць пад сабой ніякай падставы: ніхто ні ў Расіі, ні ў Беларусі «адмяняць долар» не будзе.

Акрамя таго, трэба разумець, што сярэднядзённы абарот долара на Беларускай валютна-фінансавай біржы ў дзясятак разоў меншы за пазабіржавы. Таму банкі актыўна купляюць-прадаюць валюту. А насельніцтва ў нас даўно з'яўляецца чыстым прадаўцом валюты. А хто ў іх яе купляе? Банк. Толькі ў маі банкі купілі на 118 мільёнаў долараў больш, чым прадалі.

Галоўным застаецца тэзіс, пра тое, што не долар, а юань з'яўляецца галоўнай валютай у РФ, і не долар ці еўра, а расійскі рубель — у Беларусі.

## Дэпазіт

Цяпер мае сэнс афармляць дэпазіт толькі ў беларускіх і расійскіх рублях, звяртае ўвагу фінансавы кансультант. Даходнасць па дэпазітах у валюце набліжаецца да нуля і не пакрывае інфляцыю. Адкрываць уклад у доларах варта толькі з мэтай захоўваць грошы не дома, а ў іншым месцы.

Самыя выгадныя ўклады ў нацыянальнай валюце на тэрмін два гады і больш. Розныя банкі прапануюць фіксаваную прыбытковасць ад 13 % да 14 %. Пры памяншэнні тэрміну дэпазіту да 6—9 месяцаў даходнасць складае ўжо 10-12 % гадавых. Пры кароткатэрміновых укладах на 1—3 месяцы даходнасць складзе ад 1 % да 9,5 % гадавых.

Расійскія рублі на нашым фінансавым полі ўжо не такія прывабныя як свае. Ёсць магчымасць пакласці суседскія рублі на два гады і атрымаць 12,5 % гадавых. Пры тэрміне 6—9 месяцаў з расійскіх рублёў магчыма «наварыць» 9-12 %, а пры тэрміне 1—3 месяцаў — да 10 % гадавых. Атрымліваецца, што кароткія грошы выгадней захоўваць менавіта ў расійскіх рублях.

Пачынаюць карыстацца папулярнасцю ўклады ў кітайскіх юанях. Самы выгадны дэпазіт на два і больш гадоў прынясе 3,5-3,7 % гадавых. Адкрыццё ўкладу на 6—9 месяцаў прадугледжвае даходнасць 2,5-3 % гадавых.

Але трэба памятаць, што калі ўклад у беларускіх рублях ляжыць менш чым год, а ўклад у валюце — менш чым два гады, то з даходу прыйдзецца заплаціць падатак па стаўцы 13 %.

Пры павелічэнні сумы назапашванняў адначасова з'яўляецца вопыт валодання грашыма. У гэтым выпадку прапануецца разглядаць уклады як невялікую частку інвестыцыйнага партфеля — да 20 % і арыентавацца на дэпазіты менавіта ў беларускіх рублях.

## У аблігацыях ёсць доля рызыкі

Гэтыя каштоўныя паперы могуць быць цікавым інструментам, паколькі іх прыбытковасць вядомая загадзя, як і ў банкаўскіх дэпазітаў. У той жа час вяртанне ўкладаў гарантавана дзяржавай, а на аблігацыі, як даўгавыя каштоўныя паперы, такая гарантыя не распаўсюджваецца.

Эмітэнтам можа быць дзяржава або юрыдычная асоба, якія выпускаюць аблігацыі і бяруць такім чынам у чалавека пазыку. Па дзяржаўных аблігацыях даходнасць, як правіла, ніжэй, чым па камерцыйных, але дзяржаўныя аблігацыі лічацца больш надзейнымі.

Раней у карпаратыўных каштоўных папер была прывязка да долара ці еўра. Яны і цяпер яшчэ існуюць на руках у кліентаў, але... Ужо больш як два гады карпаратыўныя аблігацыі ў валюце не прапануюцца спажыўцам. Самыя прыбытковыя рублёвыя аблігацыі — у фінансавых ліхвяраў і ламбардаў, з разліку 20-24 % гадавых. Усё накшталт старых правілаў, але ёсць змены.

З другой дэкады чэрвеня ўлікам і захоўваннем дэпазітарных аблігацый займаецца Рэспубліканскі цэнтральны дэпазітарый каштоўных папер. Перад купляй дэпазітарных аблігацый неабходна адкрыць рахунак «дэпо» (50 рублёў). А абслугоўванне гэтага рахунку ў залежнасці ад колькасці выпускаў каштоўных папер, якія ўлічваюцца на рахунку «дэпо», складае 0,15 рубля, але не менш за 15 рублёў у месяц.

Дадзены дэпазітарый падпарадкоўваецца галоўнаму банку краіны. За паслугі ён бярэ з уладальнікаў аблігацый частку даходных грошай. Добра, не збяднеем, абы новы механізм кантролю сапраўды сачыў за тым, каб фінансы спажыўцоў «не сплылі налева».

Пры куплі карпаратыўных аблігацый варта ацаніць фінансавы стан эмітэнта, з якой мэтай ён выпускае аблігацыі: для маштабавання, пашырэння вытворчасці або каб прыцягнуць грошы, таму што ёсць праблемы.

Можна разглядаць куплю аблігацый, але важна разумець сутнасць інструмента. Калі вы не гатовыя да больш высокіх рызык, лепш прыгледзецца да дзяржаўных аблігацый (але і даходнасць у іх будзе значна ніжэй).

## Крыптавалюта, тэхніка і іншыя буйныя пакупкі

Эксперыментаваць з незнаёмымі інструментамі можна, але рызыкуючы максімум 2 % ад назапашанага, лічаць эксперты. Чаму менавіта такая лічба? Каб не было занадта балюча ад страты грошай. Трэба даваць сабе справаздачу, з якой сумай вы гатовыя развітацца, у кагосьці гэта 10 рублёў, а ў кагосьці — 10 тысяч долараў.

З крыптавалютай трэба спачатку разабрацца ў тэме, перш чым інвеставаць (універсальны савет для любой справы), і ацаніць, якую суму вы гатовыя страціць, калі ўкладанні акажуцца няўдалымі.

Спрабаваць захаваць грошы ў некалькіх тэлевізарах або халадзільніках — дакладна дрэнная ідэя. Гэта проста выкіданне грошай. Мы жывем не ў савецкія часы, калі быў дэфіцыт халадзільнікаў ці яшчэ чагосьці, што можна было потым з лёгкасцю прадаць. Цяпер, калі вы купляеце другі халадзільнік, які не патрэбен, лепш аддаць гэтыя грошы на дабрачыннасць.

У мяне сусед у 2018 годзе купіў тры вялізныя ўпакоўкі макаронаў. Дзве з іх ён потым выкінуў, таму што іх з'ела харчовая моль. Рабіць пакупкі пра запас варта, толькі калі вам сапраўды трэба карыстацца канкрэтнай рэччу, а не замарожваць у ёй грошы.

## Нерухомасць

У беларусаў заўсёды была цікавасць да куплі кватэры як спосабу захаваць грошы. Нюанс такога інвеставання — калі вы ўкладзяце ў кватэру ўсе свабодныя грошы, атрымаецца, што вы не выконваеце правіла «не складаць усе яйкі ў адзін кошык».

Гэта даволі часты запыт у агенцтвах нерухомасці — выбраць ліквідную кватэру для здачы ў арэнду. Няхай даходнасць будзе невысокая, у рамках 5-6 %, але гэта папулярная тэма для тых, хто хоча захаваць грошы ў валюце і атрымліваць стабільны штомесячны прыбытак.

Трэба звярнуць увагу на тое, што крыху больш як 10 гадоў таму валютныя ўклады падразумевалі даходнасць да 8 % гадавых у валюце. Таму магло паўстаць пытанне, у чым больш выгадна зберагаць назапашванні — у квадратных метрах або ў банкаўскіх дэпазітах. Але ў апошнія гады дэпазіты не пакрываюць нават інфляцыю долара. Банкам валюта нецікавая, цяпер стаўкі па ўкладах у доларах складаюць ад 0,1 % да 1,2 % гадавых.

Так што людзі разглядаюць варыянты ўкладання грошай у куплю (пад здачу) кватэры або невялікага памяшкання на першым паверсе шматкватэрнага дома. Пакуль рынак не перанасычаны арэндным жыллём, здача кватэры здольная прынесці невялікі прыбытак, лічаць эксперты.

Дастаткова на рынку і выпадковых інвестараў: бацькі купляюць кватэру для дзіцяці, якое будзе паступаць у ВНУ і вучыцца ў Мінску. Спачатку яе здаюць у арэнду і атрымліваюць даход, потым у студэнта з'яўляецца кватэра, і не трэба выдаткоўвацца на арэндную.

Выбіраючы такое жыллё, абавязкова трэба ацаніць яго месца ў горадзе, каб яно было цікавым патэнцыйным кватарантам. У сталіцы ўмоўныя 5—7 % даходнасці вашых інвестыцый можна мець як з новабудоўлі, так і са старой кватэры побач з метро. Але ў новабудоўлі трэба будзе пачакаць здачы яе ў эксплуатацыю і ўкласціся ў аздабленне і мэбліроўку — гэта плюс 20 тысяч долараў мінімум у эквіваленце да цаны кватэры, а ліквідную кватэру ў старым доме можна здаваць адразу пасля пакупкі. Так што «сумы ўваходу» ў арэндны бізнэс тут розныя.

Так, умоўная маленькая хрушчоўка каля метро, калі ў доме прайшоў капрамонт, з прыстойным інтэр'ерам і добрымі суседзямі, можа прыносіць даход, як новабудоўля, і, галоўнае, грошы пачынаюць працаваць адразу пасля пакупкі.

Ці выгадна цяпер купіць кватэру, каб праз год-два перапрадаць яе даражэй і зарабіць? Сапраўды маленькіх цэн на ліквідныя кватэры на другасным рынку ўжо няма, яны ўжо значна падраслі. Прадаць потым даражэй? Пытанне, ці будзе гэта даражэй.

Паводле прагнозаў на 2024 год, ліквідныя кватэры вырастуць на 5-7 %. Афармляць дзве здзелкі за год дзеля 7 % — гэта не вельмі добрая ідэя. Другое па папулярнасці пытанне — дзе ўзяць танную новабудоўлю на стадыі катлавана. Цяпер еўрадвушкі прадаюцца ўжо па 1350 долараў за «квадрат», і не факт, што да моманту здачы яны будуць істотна даражэй. Ёсць прапановы за 1100—1200 долараў за квадратны метр, але здача такога дома запланавана на 4-ы квартал 2027 года. А гэта ўжо не хуткія інвестыцыі.

Зразумелых звычайнаму чалавеку варыянтаў захаваць грошы не так і шмат. Так што «метры» адназначна будуць папулярным інструментам, каб паспрабаваць захаваць грошы. Але шмат зарабіць на хуткай куплі і перапродажы кватэры ўжо ў гэтым, ды і ў наступным годзе наўрад ці атрымаецца.

## Золата

Актыў патрэбен для стабілізацыі ўсяго інвестпартфеля. Але гэта ні ў якім разе не ювелірныя ўпрыгажэнні: як фізічны актыў каштоўнасць маюць толькі банкаўскія злiткі. Іх можна купіць рознай каліброўкі — ад 1 грама да кілаграма.

У крызісы золата знаходзіцца плюс-мінус на адным узроўні, а калі іншыя актывы растуць, золата можа нават знізіцца ў кошце. Але ў доўгатэрміновай перспектыве гэта нядрэнны спосаб захаваць грошы. Многія фінансісты лічаць, што золата павінна быць у любым выпадку, пажадана 10 % ад партфеля інвестыцый. Каб не купляць фізічны злітак і не задавацца пытаннямі, дзе яго захоўваць, можна набыць золата на фондавым рынку.

Каштоўны метал — гэта не пра зарабіць, а пра захаваць грошы. Можна разглядаць гэты варыянт зберажэнняў з улікам таго, што гэта доўгатэрміновы інструмент, на дзесяць і больш гадоў. Ён падыдзе, калі ёсць магчымасць выключыць са свайго абароту пэўную суму і закансерваваць яе.

## Падушка, мэта і стратэгія

Першае, пра што трэба паклапаціцца пры любой суме назапашванняў, — у вас павінна быць асобная падушка бяспекі. Для інвестыцый падыходзяць толькі тыя сродкі, якія назапашаныя звыш гэтай сумы, звяртаюць увагу фінансісты.

Важна, каб гэтымі грашыма можна было скарыстацца ў любы момант. Гэта не значыць, што яны павінны быць у наяўным выглядзе — проста ў хуткім доступе. Калі вельмі хочацца, каб грошы з падушкі бяспекі хоць неяк працавалі, і вы вырашыце аформіць банкаўскі дэпазіт, то гэта павінна быць не больш за 20 % ад сумы і не больш чым на тры месяцы.

Наступнае — вызначыцеся з мэтай, навошта вы зберагаеце грошы, і толькі потым выбірайце спосаб. Калі на першы ўнёсак на кватэру грошы спатрэбяцца праз год, то няма сэнсу карыстацца доўгатэрміновымі інструментамі. Ні пра якія інвестыцыі на фондавым рынку гаворкі не ідзе, гэта максімум купля валюты і банкаўскі дэпазіт альбо набыццё аблігацый з кароткім тэрмінам выплаты.

Калі мэта — пасіўны прыбытак на пенсіі, тады можна разгледзець варыянт інвестыцый на фондавым рынку. Можна набыць аблігацыі і акцыі, а таксама золата або нерухомасць.

Трэцяе — выберыце стратэгію. Можаце дазволіць сабе толькі банкаўскі дэпазіт? Вылучыце на яго частку грошай. Праз паўгода перагледзьце, ці вырасла розніца паміж даходамі і выдаткамі: магчыма, прыйшоў час выкарыстоўваць дадатковыя інструменты.

Чацвёртае — ацэніце рызыкі, да якіх вы гатовыя. Калі да мінімальных, то вашым варыянтам будзе банкаўскі дэпазіт (вяртанне гарантуецца дзяржавай, але рызыкі так ці інакш ёсць).

Лагічна, што чым вышэй сума, якую вы размяшчаеце, тым больш магчымасцяў. Калі ў вас ёсць пяць тысяч долараў (у эквіваленце), частку можна размясціць на банкаўскім дэпазіце, частку перавесці ў наяўную валюту і купіць дзяржаўныя аблігацыі, лічыць фінансавы кансультант. Са зберажэннямі ў 50 тысяч долараў і больш можна выходзіць на фондавы рынак, набываць акцыі, аблігацыі і фонды акцый і аблігацый, разглядаць куплю нерухомасці для здачы ў арэнду. Галоўнае — разумець, што грошы не губляюць сваю вагу толькі ў тым выпадку, калі яны працуюць, а не ляжаць пад падушкай.

**Сяргей КУРКАЧ.**

БТА БАНК

# Финансовая отчетность и заключение независимого аудитора Закрытого акционерного общества «БТА Банк» за год, закончившийся 31 декабря 2023 года

ЗАО «БТА БАНК»

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ НА 31 ДЕКАБРЯ 2023 ГОДА

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 31 декабря 2023 года | 31 декабря 2022 года (пересчитано) | 31 декабря 2021 года (пересчитано) |
|---|---|---|---|---|
| **АКТИВЫ** | | | | |
| Денежные средства | 6 | 13134 | 7509 | 7776 |
| Средства в Национальном банке | 7 | 49885 | 31015 | 30849 |
| Средства в банках | 8 | 57877 | 51617 | 25244 |
| Кредиты и иные активные операции с клиентами | 9 | 228488 | 210951 | 235067 |
| Ценные бумаги | 10 | 87583 | 74677 | 80065 |
| в т.ч. заложенные по сделкам РЕПО | 10 | 71489 | 30440 | 28080 |
| Основные средства | 11 | 10766 | 9734 | 9815 |
| Нематериальные активы | 12 | 4151 | 2925 | 2143 |
| Активы, предназначенные для продажи | 13 | 2988 | 3578 | 1072 |
| Активы в форме права пользования | 14 | 465 | 622 | 639 |
| Отложенные налоговые активы | 15 | 451 | 0 | 0 |
| Прочие активы | 16 | 4030 | 4200 | 1557 |
| **Итого активы** | | **459818** | **396828** | **394227** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| Средства Национального банка | | 0 | 0 | 12049 |
| Средства банков | 17 | 81509 | 46498 | 16071 |
| Средства клиентов | 18 | 292135 | 273962 | 281669 |
| Субординированные займы | 19 | 20930 | 18285 | 17154 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 20 | 1477 | 0 | 13761 |
| Оценочные обязательства | 21 | 940 | 530 | 524 |
| Обязательства по аренде | 22 | 484 | 627 | 607 |
| Обязательства по текущему налогу на прибыль | 15 | 665 | 100 | 11 |
| Производные финансовые обязательства | | 0 | 0 | 14 |
| Отложенные налоговые обязательства | | 0 | 73 | 292 |
| Прочие обязательства | 23 | 1811 | 1587 | 517 |
| **Итого обязательства** | | **399951** | **341662** | **342669** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| Зарегистрированный уставный фонд | 24 | 24747 | 24747 | 24747 |
| Эффект гиперинфляции уставного фонда, эмиссионного дохода | | 20571 | 20571 | 20571 |
| Накопленная прибыль | | 25678 | 21621 | 17649 |
| Эффект гиперинфляции накопленной прибыли | | (18047) | (18047) | (18049) |
| Результаты переоценки статей баланса и резервы | | 6918 | 6274 | 6640 |
| **Итого капитал** | | **59867** | **55166** | **51558** |
| **ИТОГО КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | **459818** | **396828** | **394227** |

ЗАО «БТА БАНК»

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ ИЛИ УБЫТКЕ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 2023 год | 2022 год (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы, рассчитанные с использованием эффективной процентной ставки | 25 | 34632 | 33535 |
| Прочие процентные доходы | 25 | 283 | 220 |
| Процентные расходы, рассчитанные с использованием эффективной процентной ставки | 25 | (13440) | (21307) |
| **Чистые процентные доходы** | | **21475** | **12448** |
| Чистые расходы по формированию оценочных резервов по финансовым активам | | (14461) | (6819) |
| **Чистые процентные доходы после формирования оценочных резервов по финансовым активам** | | **7014** | **5629** |
| Доходы за услуги | 26 | 6432 | 5304 |
| Расходы за услуги | 26 | (1606) | (1897) |
| **Чистые доходы за услуги** | | **4826** | **3407** |
| Чистые доходы от операций с иностранной валютой | | 7207 | 8149 |
| Чистые расходы по финансовым инструментам, оцениваемым по амортизированной стоимости | | (310) | (175) |
| Прочие чистые непроцентные доходы | | 207 | 191 |
| Чистые доходы (расходы) по операциям с производными инструментами | | 222 | (15) |
| Прочие доходы | 27 | 1786 | 412 |
| Чистые расходы по формированию оценочных резервов по финансовым гарантиям и обязательствам по предоставлению денежных средств | | (330) | (176) |
| **Прочие расходы** | | **(16337)** | **(13581)** |
| *Расходы на персонал* | 28 | (9471) | (7930) |
| *Прочие операционные расходы* | 28 | (6866) | (5651) |
| **Прибыль до расходов по налогу на прибыль** | | **4285** | **3841** |
| Расходы по налогу на прибыль | 15 | (228) | 134 |
| **Прибыль** | | **4057** | **3975** |
| **Прибыль на акцию** | **24** | **2,92** | **2,86** |

ЗАО «БТА БАНК»

## ОТЧЕТ О ПРОЧЕМ СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 2023 год | 2022 год (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **Прибыль за год** | | **4057** | **3975** |
| **Прочий совокупный доход** | | | |
| *Статьи, которые впоследствии не будут реклассифицированы в состав прибылей или убытков:* | | | |
| Результат от изменения стоимости зданий | 11 | 859 | 123 |
| Расход по отложенному налогу на прибыль от изменения стоимости зданий | 15 | (215) | (31) |
| **Итого прочий совокупный доход** | | **644** | **92** |
| **Итого совокупный доход за год** | | **4701** | **4067** |

ЗАО «БТА БАНК»

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В СОБСТВЕННОМ КАПИТАЛЕ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | Акционерный капитал | Результаты переоценки статей баланса и резервы | Накопленная прибыль с учетом эффекта гиперинфляции накопленной прибыли | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|---|
| **1 января 2022 года** | | **45318** | **6495** | **1535** | **53348** |
| **Корректировки** | **5** | **0** | **145** | **(1936)** | **(1791)** |
| **1 января 2022 года (после корректировок)** | | **45318** | **6640** | **(401)** | **51557** |
| **Чистая прибыль за год** | | **0** | **0** | **3975** | **3975** |
| **Прочий совокупный доход:** | | | | | |
| Изменение стоимости основных средств за счет переоценки | | 0 | 92 | 0 | **92** |
| Изменение резерва | | 0 | (458) | 0 | **(458)** |
| **Итого совокупный доход за год** | | **0** | **(366)** | **3975** | **3609** |
| **31 декабря 2022 года** | | **45318** | **6274** | **3574** | **55166** |
| **1 января 2023 года** | | **45318** | **6274** | **3574** | **55166** |
| **Чистая прибыль за год** | | **0** | **0** | **4057** | **4057** |
| **Прочий совокупный доход:** | | | | | |
| Изменение стоимости основных средств за счет переоценки | | 0 | 644 | 0 | **644** |
| **Итого совокупный доход за год** | | **0** | **644** | **4057** | **4701** |
| **31 декабря 2023 года** | | **45318** | **6918** | **7631** | **59867** |

ЗАО «БТА БАНК»

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 2023 год | 2022 год (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **ДЕНЕЖНЫЕ ПОТОКИ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Проценты полученные | | 35942 | 34027 |
| Проценты уплаченные | | (13397) | (21281) |
| Комиссии полученные | | 6941 | 6192 |
| Комиссии уплаченные | | (1624) | (1616) |
| Реализованный доход за вычетом расходов по операциям с иностранной валютой | | 7701 | 8224 |
| Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | | 222 | 0 |
| Расходы на персонал | | (9471) | (7974) |
| Прочие полученные доходы | | 1786 | 3761 |
| Прочие уплаченные расходы | | (5991) | (4997) |
| Уплаченный налог на прибыль | | (330) | 0 |
| **Денежная прибыль до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого** | | **21779** | **16336** |
| Чистый прирост денежных средств в Национальном банке | | (8) | (89) |
| Чистое прирост денежных средств в банках | | (379) | (87) |
| Чистый прирост денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | | (140) | 0 |
| Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | | (28784) | 21837 |
| Чистый прирост денежных средств в прочих активах | | (100) | (2739) |
| **Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого** | | **(29411)** | **18922** |
| Чистое снижение денежных средств Национального банка | | 0 | (11588) |
| Чистый прирост денежных средств банков | | 34737 | 30294 |
| Чистое снижение денежных средств клиентов | | (4513) | (17769) |
| Чистый прирост денежных средств от ценных бумаг банка | | 1534 | 0 |
| Чистый прирост денежных средств в прочих обязательствах | | 292 | 813 |
| **Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого** | | **32050** | **1750** |
| **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности** | | **24418** | **37008** |
| **ДЕНЕЖНЫЕ ПОТОКИ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | 11, 12 | (3035) | (1565) |
| Поступления от выбытия основных средств и нематериальных активов | 11, 12 | 1 | 0 |
| Продажа активов, предназначенных для продажи | | 1746 | 0 |
| Покупка ценных бумаг, оцениваемых по амортизированной стоимости | | 0 | (72428) |
| Продажа ценных бумаг, оцениваемых по амортизированной стоимости | | 0 | 73114 |
| **Чистое расходование денежных средств от инвестиционной деятельности** | | **(1288)** | **(879)** |
| **ДЕНЕЖНЫЕ ПОТОКИ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выпуск облигаций | | 0 | 5570 |
| Погашение облигаций, выпущенных банком | | 0 | (19324) |
| Платежи в отношении основной суммы обязательства по аренде | | (293) | (322) |
| **Чистый отток денежных средств, использованных от финансовой деятельности** | | **(293)** | **(14076)** |
| Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | | 7476 | 4464 |
| Влияние изменений в ожидаемых кредитных убытках на денежные средства и эквиваленты денежных средств | | (262) | 0 |
| **Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов** | **6** | **30051** | **26517** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода** | **6** | **87224** | **60707** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода** | **6** | **117275** | **87224** |

И. О.
Председателя Правления
Д.П. Кулевацкий

26 июня 2024 года
г. Минск

Главный бухгалтер
С.Е. Сенько

26 июня 2024 года
г. Минск

УНП 807000071

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ НЕЗАВИСИМОГО АУДИТОРА

Господину Кулевацкому Дмитрию Павловичу, исполняющему обязанности Председателя Правления ЗАО «БТА Банк»
Акционерам и Правлению ЗАО «БТА Банк»

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой финансовой отчетности Закрытого акционерного общества «БТА Банк» (далее – «аудируемое лицо» или «Банк») (место нахождения: 220123, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20-2; дата государственной регистрации 25 июля 2002 года; регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – 807000071), состоящей из отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2023 года, отчетов о прибыли и убытке, прочем совокупном доходе, об изменениях в собственном капитале и движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к финансовой отчетности, состоящих из существенной информации об учетной политике и прочей пояснительной информации.

По нашему мнению, прилагаемая финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение Банка по состоянию на 31 декабря 2023 года, а также его финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (МСФО).

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальных правил аудиторской деятельности и Международных стандартов аудита. Наши обязанности в соответствии с указанными требованиями и стандартами описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности» нашего аудиторского заключения.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего аудиторского мнения.

**Независимость**

Мы независимы по отношению к Банку в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальных правил аудиторской деятельности и Международного кодекса этики профессиональных бухгалтеров (включающим Международные стандарты независимости), выпущенного Советом по международным стандартам этики для бухгалтеров (Кодекс СМСЭБ), и нами соблюдались прочие принципы профессиональной этики в соответствии с данными требованиями.

**Наша методология аудита**

| | |
|---|---|
| **Существенность** | • Существенность на уровне финансовой отчетности Банка в целом: 600 тысяч белорусских рублей, что составляет 1 % от чистых активов |
| **Ключевые вопросы аудита** | • Оценочный резерв под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и иным активным операциям с клиентами в соответствии с МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты» |

При планировании аудита мы определили существенность и провели оценку рисков существенного искажения финансовой отчетности. В частности, мы проанализировали, в каких областях руководство выносило субъективные суждения, например, в отношении значимых оценочных значений, что включало применение допущений и рассмотрение будущих событий, с которыми в силу их характера связана неопределенность. Как и во всех наших аудитах, мы также рассмотрели риск обхода системы внутреннего контроля руководством, включая, помимо прочего, оценку наличия признаков необъективности руководства, которая создает риск существенного искажения вследствие недобросовестных действий.

**Существенность**

На определение объема нашего аудита оказало влияние применение нами существенности. Аудит предназначен для получения разумной уверенности в том, что финансовая отчетность не содержит существенных искажений. Искажения могут возникать в результате недобросовестных действий или ошибок. Они считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе этой финансовой отчетности.

Основываясь на своем профессиональном суждении, мы установили определенные количественные пороговые значения для существенности, как указано в таблице ниже. С помощью этих значений и с учетом качественных факторов, мы определили объем нашего аудита, а также характер, сроки проведения и объем наших аудиторских процедур и оценили влияние искажений (взятых по отдельности и в совокупности), при наличии таковых, на финансовую отчетность в целом.

| | |
|---|---|
| **Существенность на уровне финансовой отчетности Банка в целом** | Существенность на уровне финансовой отчетности Банка в целом: 600 тысяч белорусских рублей. |
| **Как мы ее определили** | 1 % от суммы чистых активов Банка. |
| **Обоснование примененного базового показателя для определения уровня существенности** | Мы приняли решение использовать в качестве базового показателя для определения уровня существенности сумму чистых активов, так как, по нашему мнению, этот показатель широко используется в банковском секторе, в том числе органами регулирования и надзора для анализа финансового положения банков. Мы установили существенность на уровне 1 %, что попадает в диапазон приемлемых количественных пороговых значений существенности, применимых для организаций в данном секторе. |

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам.

| Ключевой вопрос аудита | Какие аудиторские процедуры были выполнены в отношении ключевого вопроса аудита |
|---|---|
| ***Оценочный резерв под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и иным активным операциям с клиентами в соответствии с МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты»*** | |
| В связи со значимостью кредитов и иных активных операций с клиентами, важностью суждений и оценок, используемых для расчета соответствующих резервов, расчет оценочного резерва под ожидаемые кредитные убытки (далее – «ОКУ») по кредитам и иным активным операциям с клиентами, считается ключевым вопросом аудита.<br>Величина оценочного резерва под ОКУ представляет собой наилучшую оценку руководством ожидаемых кредитных потерь по кредитам и иным активным операциям с клиентами по состоянию на отчетную дату.<br>Оценочный резерв под ОКУ создается Банком на индивидуальной и коллективной основе.<br>Расчет оценочного резерва под ОКУ на индивидуальной основе осуществляется Банком по задолженности существенно значимых заемщиков – корпоративных клиентов, общая сумма задолженности которых является существенной.<br>Для расчета оценочного резерва под ОКУ на индивидуальной основе Банк применяет профессиональное суждение, чтобы оценить ожидаемые денежные потоки по кредитам и иным активным операциям, а также риск или вероятность возникновения кредитных потерь, принимая во внимание обоснованно возможные сценарии, взвешенные с учетом вероятности. Модель оценки ОКУ представляет собой оценку возмещаемой стоимости кредитной задолженности, основанной на методе дисконтирования ожидаемых будущих денежных потоков. Возмещаемая стоимость кредитной задолженности определяется Банком исходя из актуальных данных о платежеспособности клиентов, признаках их финансовой неустойчивости, негативной информации, фактах нарушений графика платежей, ликвидности залогового обеспечения и другой релевантной информации. Рассматриваемые денежные потоки включают денежные потоки от продажи удерживаемого обеспечения или от других механизмов повышения кредитного качества, которые являются неотъемлемой частью договорных условий.<br>Формирование оценочного резерва под ОКУ на коллективной основе осуществляется по кредитному портфелю, разделенному на сегменты по корпоративным и розничным клиентам.<br>Ключевые параметры расчета резерва на коллективной основе:<br>- вероятность наступления дефолта контрагента (далее – «PD»). PD рассчитывается на основе последних доступных данных о дефолтах за прошлые периоды и корректируется с учетом прогнозной информации. Полученные показатели PD применяются с учетом макрофактора для учета текущих и будущих изменений в экономической среде;<br>- уровень потерь при дефолте (далее – «LGD»). LGD рассчитывается с использованием имеющейся исторической информации по возвратности по кредитным договорам клиентов и представляет собой оценку невозмещенной части актива за счет прогнозируемого денежного возмещения и возмещения за счет имеющегося обеспечения.<br>Примечания 3 «Существенная информация об учетной политике», 4 «Существенные учетные суждения и оценки», 9 «Кредиты и иные активные операции с клиентами», а также 30 «Управление рисками», включенные в финансовую отчетность, содержат подробную информацию об оценочных резервах под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и иным активным операциям с клиентами. | Мы оценили методику расчета величины оценочного резерва под ОКУ, в частности, порядок расчета резерва по кредитам и иным активным операциям с клиентами, на предмет соответствия требованиям МСФО.<br>Мы оценили и проверили (на выборочной основе) организацию и эффективность функционирования средств внутреннего контроля в отношении данных, используемых в ходе расчета оценочного резерва под ОКУ по кредитам и иным активным операциям с корпоративными клиентами, в отношении своевременности переноса просроченного долга на соответствующие счета по учету просроченной задолженности; обоснованности и документального согласования фактов реструктуризации задолженности; а также регулярности мониторинга залога.<br>Также мы оценили и проверили (на выборочной основе) организацию и эффективность функционирования средств внутреннего контроля в отношении данных, используемых в ходе расчета оценочного резерва под ОКУ по кредитам и иным активным операциям с розничными клиентами, в отношении своевременного переноса просроченного долга на соответствующие счета по учету просроченной задолженности; передачу данных о погашениях задолженности в учетных системах.<br>Мы протестировали расчет оценочного резерва под ОКУ по кредитам и иным активным операциям с корпоративными клиентами, оцениваемые Банком на индивидуальной основе. Мы проверили корректность и полноту выделения клиентов, которые оцениваются на индивидуальной основе, оценили ликвидность залогового обеспечения для тех договоров, где это было уместно. Для выбранных кредитов, отнесенных к Стадии 3, мы оценили допущения, используемые при расчете будущих денежных потоков, включая оценку финансового состояния заемщиков, а также стратегию Банка по взысканию задолженности.<br>Мы также протестировали расчет резерва под ОКУ по кредитам и иным активным операциям, предоставленным корпоративным и розничным клиентам, оцениваемым Банком на коллективной основе. Мы проанализировали используемые Банком PD и LGD. Мы пересчитали итоговый оценочный резерв под ОКУ для кредитов и иных активных операций с клиентами, оцениваемых на коллективной основе.<br>Мы провели аналитические процедуры в отношении общей суммы резервов под ОКУ по кредитам и иным активным операциям с клиентами: построили тренды; проанализировали модель оценки PD и её показатели, характеризующие качество и обоснованность применяемой модели; проанализировали корреляции между изменениями объемов кредитного портфеля и созданных резервов под ОКУ; проверили правильность представления Банком в финансовой отчетности информации в отношении оценочного резерва под ОКУ по кредитам и иным активным операциям с клиентами. |

**Важные обстоятельства**

Мы обращаем внимание на то, что сравнительные данные в финансовой отчетности были пересчитаны. В примечании 5 раскрыта информация об изменениях в представлении финансовой отчетности и исправлении ошибок.

Мы не выражаем модифицированного аудиторского мнения в связи с этими обстоятельствами.

**Прочие вопросы**

Аудит годовой финансовой отчетности аудируемого лица за год, закончившийся 31 декабря 2022 года, был проведен другой аудиторской организацией, которая в аудиторском заключении от 17 мая 2023 года выразила аудиторское мнение о том, что данная финансовая отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Банка по состоянию на 31 декабря 2022 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с МСФО.

**Обязанности аудируемого лица по подготовке финансовой отчетности**

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и достоверное представление финансовой отчетности в соответствии с МСФО и за систему внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке финансовой отчетности руководство несет ответственность за оценку способности Банка продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление финансовой отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать Банк, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора над процессом подготовки финансовой отчетности ЗАО «БТА Банк».

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что финансовая отчетность не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, содержащего выраженное в установленной форме наше аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности и Международными стандартами аудита, всегда выявляет все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь и Международными стандартами аудита, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

• выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения существенного искажения в результате ошибки, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

• получаем понимание системы внутреннего контроля, имеющей значение для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля Банка;

• оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность оценочных значений, рассчитанных руководством, и соответствующего раскрытия информации в финансовой отчетности;

• оцениваем правильность применения руководством Банка допущения о непрерывности деятельности, а на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в нашем аудиторском заключении к соответствующему раскрытию информации в финансовой отчетности. В случае, если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, на следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения. Однако будущие события или условия могут привести к тому, что Банк утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

• проводим оценку представления финансовой отчетности в целом, ее структуры и содержания, лежащие в ее основе операции и события так, чтобы было обеспечено их достоверное представление.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, отвечающими за корпоративное управление, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированном объеме и сроках аудита, а также о существенных замечаниях по результатам аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля, которые мы выявляем в ходе аудита.

Мы также предоставляем лицам, отвечающим за корпоративное управление, заявление о том, что мы соблюдали все соответствующие этические требования в отношении независимости и информировали этих лиц обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать оказывающими влияние на независимость аудитора, а в необходимых случаях – о соответствующих мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда публичное раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят общественно значимую пользу от ее раскрытия).

АйКьюТи Эшуранс

Руководитель задания, директор
Тимофиевич Дмитрий Михайлович
Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь №0002397 от 12 мая 2017 года.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах, № 135 от 02 июня 2022 года, срок действия до 02 июня 2027 года.

Руководитель аудиторской группы
Абойшева Анна Михайловна
Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь №0001351 от 29 мая 2006 года.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах, № 155 от 29 июня 2023 года, срок действия до 29 июня 2028 года.

**Аудиторская организация:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «АйКьюТи Эшуранс».
**Место нахождения:** г. Минск, пр-т Независимости, д. 32А, строение 3, помещение 73.
**Сведения о государственной регистрации:** зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом решением от 21 мая 2010 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191315745. Свидетельство о государственной регистрации № 0000520.
**Регистрационный номер записи в реестре аудиторских организаций:** 10065.

Дата подписания аудиторского заключения: 26 июня 2024 года.

Дата получения аудиторского заключения Банком: 26 июня 2024 года.

БТА

И.о. Председателя Правления ЗАО «БТА Банк»
Кулевацкий Дмитрий Павлович

Відавочца Перамогі

# «Мы, дзетдомаўскія, — жывучыя...»

**Лізавета Пятроўна Хомчанка 10-гадовай дзяўчынкай перажыла блакаду Ленінграда. Той страшнай зімой яна страціла тату, маці, дзядулю. Фотаальбом, дзе з даваенных здымкаў глядзяць шчаслівыя твары яе родных, яна аднавіла ўжо пасля вайны. Збірала па знаёмых і сваяках усё, што датычылася яе даваеннага бестурботнага дзяцінства. Нядаўна мы разам з ёй яго пагарталі.**

## НА МОВЕ ГЛУХАНЯМЫХ

Фотаздымкі ў альбоме як карцінкі са старадаўніх часопісаў. Некаторыя нават з клеймамі фотамайстэрань Санкт-Пецярбурга. На адным з іх важны пан у касцюме з камізэлькай і тонкімі, модна загнутымі ўгору вусамі.

— Гэта мой дзядуля па лініі маці, — кажа Лізавета Пятроўна. — Ён быў дваранін. Мы жылі ў Ленінградзе з бацькамі маці, але бабуля да вайны памерла. Я яе амаль не помню, яна ўвесь час хварэла. Дзед працаваў у тыпаграфіі начальнікам цэха.

Сямейства займала два пакоі на пятым паверсе ў старым доме па вуліцы Рылеева непадалёк ад Неўскага праспекта. Побач знаходзіўся Таўрычны сад, куды дзяцей вадзілі гуляць. Акрамя Лізы ў сям'і быў яшчэ малодшы брат. Калі пачалася вайна, ёй споўнілася 10 гадоў, а брату — тры.

Маці ў Лізаветы Пятроўны карэнная ленінградка, а вось тата — з Магілёва. Пазнаёміліся маладыя выпадкова. Прыгажуня Алена ехала ў беларускі горад на практыку, а Пётр — наведаць бацькоў. Яны жылі ў Магілёве ў сваім доме непадалёк ад невялічкай рэчкі Струшні. Сёння гэта адно з цікавых гістарычных месцаў горада. Маладыя пазнаёміліся, і завязалася сяброўства. Пётр пэўны час жыў у Мурманску і адтуль слаў у Ленінград лісты спадарожніцы, якая яму спадабалася. Лізавета Пятроўна ўсміхаецца, успамінаючы, як яе бацька акрамя лістоў слаў сваёй Алене яшчэ і бочачкі з мурманскай рыбай.

У фотаальбоме шмат здымкаў маленькай Лізы і яе брата. З нязвыклых іх нават можна пераблытаць. Абодва ў шыкоўных нарадах з мностам валанаў, бантамі, доўгімі хвалістымі валасамі. «У брата банцік на шыі, у мяне — на галаве, — дапамагае разабрацца суразмоўніца. — Маці вельмі любіла нас прыбіраць. Шыла прафесійна: какетачка, дзве стужачкі, зборачкі, валанчыкі, банты. Я заўсёды была адзета як лялька. Калі мяне прывозілі на лета ў Магілёў і мы ішлі да таксі ад чыгуначнага вакзала, людзі з цікаўнасцю глядзелі на мяне». Маленькая Ліза здзіўляла дарослых яшчэ і тым, што дасканала ведала мову глуханямых.

— Маці была настаўніцай гэтай мовы, і мне таксама хацелася яе ведаць, — расказвае Лізавета Пятроўна. — Я залазіла пад стол, загароджвалася карзінай і з пальцаў складвала літары як на карцінках. Прыбегла аднойчы на кухню і на пальцах паказала маці, што хачу ад яе ўвагі. Яна тады вельмі раззлавалася і стала ляпаць мне ручніком па руках. Баялася, што я перастану размаўляць.

Гэта мова мне ўсё ж такі спатрэбілася. Пасля вайны пэўны час працавала ў Магілёве перакладчыкам для глуханямых, перакладала ім лекцыі ў клубе. Ён знаходзіўся непадалёк ад драмтэатра на Віленскай вуліцы.

## РОДНЫЯ СЫШЛІ АДЗІН ЗА АДНЫМ

Аднойчы дзень пачаўся не так, як заўсёды. У крамах з палічак сталі хутка знікаць тавары, на дахі ленінградскіх дамоў з неба пасыпаліся запальныя бомбы. Так пачалася вайна. Кватэра была на апошнім, пятым паверсе, і маленькая Ліза з дзвярэй сваёй кватэры назірала, як мітусіліся ў дахавым праёме мужчыны. Яны шчыпцамі хапалі нейкія палаючыя прадметы і кідалі іх уніз. Дзед толькі паспяваў адцягваць ад дзвярэй унучку, каб не здарылася бяды.

— Я малая зусім была, тры класы да вайны скончыла, — кажа суразмоўніца. — Запомніла з класа толькі аднаго вучня — Дзіму Дзёжкіна. Мы з ім выдатнікі былі, нас часта хвалілі. Калі пачалася вайна, спачатку не разумела, як гэта страшна. Але хутка ў адзін момант пасталела. Кожны дзень бамбёжкі, Ленінград гарэў, дамы разбураліся. З паўразбураных будынкаў звешвалася мэбля. Было нават відаць ложкі, на якіх мёртвыя ляжалі.

...Спачатку загінуў бацька. Ён працаваў на суднабудаўнічым заводзе імя Андрэ Марці. Работы было столькі, што ён нават не прыходзіў дамоў, заставаўся на ноч. Бамбёжкі не перапыняліся. Аднойчы сямейству паведамілі, што іх бацька загінуў.



— Потым ад голаду захварэў дзед, — успамінае жанчына. — Ён не еў тое, што давалі па картачцы, аддаваў нам. Неяк маці пайшла на плошчу Працы, каб нешта дастаць з ежы. І не вярнулася. Хворы дзед, брат зусім малы, я — за старшую. Праз два дні домакіраўнік сказаў мне: маці не чакай, яна трапіла пад артабстрэл і загінула. Дзед пасля гэтага хутка пайшоў з жыцця. Неяк прачнулася ноччу ад яго крыкаў: «Лена, Лена». Потым заціх. Раніцай, калі я зайшла ў яго пакой, ён быў ужо мёртвы. Дворніку сказала, што дзядуля памёр, ён яго забраў і завёз у морг. Так мы з братам засталіся ўдвух.

Зіма для дзесяцігадовай дзяўчынкі і трохгадовага хлопчыка была вельмі жорсткай. Дзяўчынка з удзячнасцю ўспамінала свайго бацьку, які паспеў зрабіць для сям'і жалезную печ з трубой, якая выходзіла ў фортачку. Брацік заставаўся дома, а сястра бегла ў горад і папрашайнічала. Каля дома была крама, куды прывозілі дуранду — спрасаваныя бруські адходаў, якія заставаліся ад вытворчасці мукі. У самую страшную і галодную першую блакадную зіму дуранда выратавала сотні тысяч жыццяў ленінградцаў. У тым ліку і Лізы з яе братам. Дзяўчынка варыла сталярны клей, які адшукала ў бацькавых запасах. Атрымлівалася нешта накшталт студня. Так і жылі.

— Да хлебазаводаў хадзіла, каб кавалачак які кінулі, — успамінае яна. — Калі пачыналася паветраная трывога, людзі павінны былі хавацца. У кожным двары выносілі нейкую машыну-шарманку і круцілі: «У-у-У-у-У». Дарослыя хапалі мяне ззаду за паліто і цягнулі ў падваротню. А ў мяне брат дома, мне трэба было бегчы да яго. І я хлусіла, казала, што дом мой побач, праз 10 метраў. І мяне адпускалі. Баялася, што дом разбамбяць і брат загіне. Адчыняла дзверы, і ён ад радасці, што я вярнулася, скакаў. Вельмі баяўся грукату бамбёжак.

У блакадным Ленінградзе Ліза з братам знаходзіліся да вясны, а потым, калі быў прарыў блакады, іх вывезлі разам з іншымі ленінградскімі дзецьмі праз Ладагу. Як пратрымаліся, Лізавета Пятроўна і цяпер не ведае. Напэўна, Бог дапамог.

— Да вайны нічога не ўмела, усяму жыццё навучыла, — кажа блакадніца. — Бачыла шмат нябожчыкаў на вуліцах Ленінграда. Людзі падалі і паміралі. Спачатку спрабавалі ім руку падаць. Думалася, спатыкнуўся чалавек і ўпаў. І ў мяне пару такіх выпадкаў было. Потым перасталі падаваць руку, таму што ведалі: раз чалавек упаў, значыць, памірае. Ды і самі ўжо ледзь стаялі на нагах.

## ДЗІЦЯЧЫ ДОМ

На жаль, нічога на памяць з ленінградскай кватэры Ліза не забрала.

— Дарослыя хадзілі па кватэрах і збіралі нас, як грыбы, — успамінае жанчына. — Прыйшлі і да нас з братам, сказалі: «Апранайцеся, пойдзем». Брат машынку ўзяў, а я сукенку святочную і болей нічога. У шуфлядцы ляжала маміна золата, я з ім у дзяцінстве гуляла. Дзядуля калісьці з Кітая статуэткі прыгожыя прывёз. І футры дарагія ў нас былі. Мы наогул жылі багата. У нас нават шкура мядзведзя ляжала ў пакоі перад высачэзным трумо. Фота і тыя засталіся дома, не да альбомаў тады было. Потым па людзях фатаграфіі збірала. Нас прывялі ў нейкі вялікі пакой, дзе было шмат дзяцей. Усіх памылі ў карыце і пераапранулі. Праз дзень павялі на цягнік і павезлі з Ленінграда ў вёску Ціменка Іванаўскай вобласці. Там мы з братам былі, пакуль не скончылася вайна.



Алена і Пётр былі прыгожай парай.



Дзядуля Казімір з унукамі — Лізай і Валянцінам.

Цягнік з дзецьмі ахоўвалі савецкія самалёты. Яны так нізка ляцелі, што нават можна было разглядзець лётчыкаў. У памяці застаўся яшчэ такі эпізод. Іх, дзяцей, вядуць праз разбомблены мост. Трэба было пераскокваць праз вялікія дзіркі ў ім, а сіл няма. Адна дзяўчынка была цалкам знясіленая, плакала, што памірае. Яе на руках несла выхавацелька Алена Канстанцінаўна. Дзяўчынка, дарэчы, выжыла.

Сукенку, якую забрала з сабой у эвакуацыю, Ліза насіла выключна па святах. Жылі ў вёсцы, у горад ездзілі з канцэртамі выступаць. Аднойчы дзяўчынку ў прыгожай сукенцы прыкмецілі мастакі з Палеха Катухіны. Яны потым яе нават у госці запрашалі. А дачка мастака Ганна пашыла Лізінаму брату мяккую цацку ў падарунак.

У дзіцячым доме над ложкам Лізы вісела вялікая карта СССР, на якой яна адзначала вызваленыя населеныя пункты. Выхавацелька кожную раніцу прыходзіла з добрымі навінамі. Спачатку дзяўчынка абводзіла адзін населены пункт, а потым, калі вызваляліся адразу раёны, замазвала фарбай адразу некалькі назваў. Выхавацелька падбадзёрвала: «Так, так, маж. Нашы ўжо там».

— Мы добра ведалі, як рухаецца вайна, і верылі, што пераможам, — кажа Лізавета Пятроўна.

## ВЯРТАННЕ ДАМОЎ

Выхавацелька хадзіла кожны дзень у сельсавет слухаць радыё — яно было толькі там. Аднойчы яна вярнулася і сабрала ўсіх разам. Пачакала, пакуль усе сцішацца, і як закрычыць: «Вайна скончылася!»

— Хвіліну стаяла мёртвая цішыня, — успамінае суразмоўніца тыя трапяткія хвіліны. — Глядзім адно на аднаго, а потым паветра разрэзалі шчаслівыя крыкі. Сталі скакаць, абдымацца. У школу ў той дзень не пайшлі — замест яе быў святочны абед. І шмат чаго на стале. А праз тры дні нас сабралі разам і павезлі ў Ленінград.

Вярнуцца дазвалялася толькі тым, каму споўнілася 14 гадоў. Ліза трапіла ў гэты спісак, а яе брат — не. Калі праязджалі Іванава, дзяўчатам далі па куску матэрыі, гэта было сапраўднае багацце.

— Мы прыехалі ў Ленінград 2 чэрвеня 1945 года, — кажа Лізавета Пятроўна. — Я добра гэта запомніла. На вакзал прыйшлі «купцы», адабралі дзяўчат асобна, хлопцаў асобна. Нас павезлі на фабрыку, а хлопцаў — у рамеснае. Першы час яны да нас прыходзілі, грукаліся ў акно. Па звычцы: як-ніяк дзіцячы дом. Потым закруцілася жыццё, вучоба, работа, і мы болей не сустракаліся.

На прадзільна-ткацкай фабрыцы дзяўчына не затрымалася. У Ленінградзе без родных было не пражыць. Таму паехала ў Магілёў да беларускай радні. Сябар яе бацькі дапамог працаўладкавацца на швейную фабрыку імя Валадарскага. А брата адшукала праз 17 гадоў. Ён працаваў у Калініградзе шафёрам у порце. Меў ужо жонку і дачку, але разам жыць у іх не атрымлівалася — жылля не было. І тады Лізавета напісала ліст у той Калінінградскі порт начальніку, дзе расказала, як іх з братам блакада па свеце раскідала. Хутка даведалася, што брату пасля гэтага далі спачатку пакой у інтэрнаце, а потым трохпакаёўку. Пасля яны нарэшце сустрэліся. Брат прыехаў у Магілёў, і радасці не было мяжы. Цяпер брата ўжо няма, але Лізавета Пятроўна не лічыць сябе адзінокай. У яе дочкі, унукі, а яшчэ шмат знаёмых сярод моладзі. Яе добра ведаюць у магілёўскіх школах №№ 1, 2, 23. А ў школе № 27 яна наогул свая. Пазітыўны настрой тлумачыць імкненнем жыць.

— Вы ведаеце, колькі мне гадоў? — какетліва пытаецца яна. — 5 мая споўнілася 93. І ўвесь час рухаюся наперад. Трое маіх дачок выраслі без бабуль і дзядуль. У мужа ўсе ў Шклове загінулі, у мяне — у Ленінградзе. Але я не скарджуся на лёс. Мы, дзеддомаўскія, — жывучыя. І праўду заўсёды гаворым. У мяне вось праўнучка падрастае, шарлатанчык маленькі. Я шчаслівая.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**


Извещение о проведении **27 августа 2024 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
